НЕ ЕЎШЫ ЛЯЖАШ, НЕ СПАЎШЫ ЎСТАНЕШ? 9

З ЧАГО НАРАДЖАЮЦЦА ВЕРШЫ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. АЎТОРАК № 196 (30076)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей ЛЯХНОВІЧ, міністр транспарту і камунікацый:

«Мы вельмі складана выходзілі з зімы. Вы самі бачылі, якая ямачнасць была на дарогах. Першым чынам трэба яе ліквідаваць. Яшчэ больш складаныя ўчасткі неабходна зрабіць бягучым рамонтам. Без урону той рэканструкцыі, якая была распачатая і якая працягваецца. З гэтым мы таксама спраўляемся. Сродкаў у гэтым годзе выдзелена 1,4 млрд рублёў на рэканструкцыю і рамонт усіх дарожных сетак. Плануем зрабіць каля 3 тысяч км дарог. Мадэрнізацыя, удасканаленне і пакрыццё, каб далей дарога магла яшчэ 7-8 гадоў адслужыць. На наступны год вельмі сур'ёзная сума прадугледжана на ўдасканаленне пакрыцця — каля 2,2 млрд рублёў. Зробім больш за 4 тысячы км дарог».

У педагогі — са школы

Падрыхтоўка педагогаў пачынаецца яшчэ са школьнай парты. У гэтым годзе больш за 6700 школьнікаў па ўсёй краіне атрымліваюць адукацыю ў педагагічных класах. Такі профіль ёсць і ў мінскай сярэдняй школе № 86 імя Фамы Занько. Анастасія ЧАПЛІНСКАЯ, Арцём АЛЯКСЕЕЎ і Дар'я БАНДАРЭНКА вучацца ў адзінаццатым педагагічным класе. Наперадзе ў іх — паступленне ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны і незабыўныя студэнцкія гады. А вопыт і веды, атрыманыя за два гады профільнага навучання, дапамогуць хутчэй асвоіцца ў прафесіях, звязаных з педагагічнай дзейнасцю.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

КАРАТКА

- ДПК: з пачатку года больш за 346 тысяч жыхароў ЕС наведала Беларусь па бязвізе.
- **Сезон вакцынацыі ад ВРІ, у тым ліку COVID-19 і грыпу, пачаўся ў Мінску.**
- На кірмашах у сталіцы больш за 3,4 тысячы прадаўцоў рэалізавала звыш 760 тон садова-агароднай прадукцыі.
- **Цытрусавы бум: разнастайнасць водараў і смакаў прадставяць у батанічным садзе 14 і 15 кастрычніка.**
- Натарыусы 13 кастрычніка бясплатна пракансультуюць шматдзетных і бацькоў дзяцей-інвалідаў.

ISSN 1990 — 763X

Шануй сваё

«ВЯНОК» І «ВЯЗАНКА»

Чым вабіць аграгарадок у Асіповіцкім раёне?

Мясціны ў Вяззі паэтычныя і неверагодна прыгожыя. Адно вадасховішча ракі Свіслач чаго вартае. На беразе тады яшчэ ракі калісьці гуляў будучы класік беларускай літаратуры Максім Багдановіч. Маёнтак Вяззе яго роднай цёткі, да якой ён прыязджаў разам з маці ў чатырохгадовым узросце, стаяў насупраць. У 1895 годзе Марыя Апанасаўна Багдановіч разам з дзецьмі некалькі месяцаў гасцявала ў сваёй старэйшай сястры Сцепаніды і яе мужа Франца Секяржыцкіх. Адсюль яна пісала лісты сужэнцу Адаму ў Гродна, у якіх падрабязна расказвала пра забавы дзяцей, жыццё ў вёсцы, падзеі, што тут адбываліся. Ад маёнтка засталіся толькі ўспаміны. Цяпер тут знаходзіцца дзіцячы аздараўленчы лагер «Крыніца». А пра сувязь з Максімам Багдановічам нагадваюць шыльда на спальным корпусе, вуліца ў гонар паэта і вялікі партрэт-мурал на будынку мясцовай школы. Гэта своеасаблівы брэнд аграгарадка, як і народны калектыў «Вязанка», у назве якога спалучыліся і знакамітыя вясковыя вязы, і назва населенага пункта, і вялікі паэт, якім тут усе ганарацца.

СТАР. 8

Жыллё

ДОМІК У ВЁСЦЫ

Купляць лепш тады, калі цана падае

Дачны сезон заканчваецца. А гэта значыць, што надыходзіць час сур'ёзна заняцца загараднай нерухомасцю, бо менавіта з лістапада да сакавіка на гэтым рынку вызначаюцца мінімальныя цэны.

Другая хваля

Дыяпазон прапаноў цяпер велізарны — на любы густ. Сёлетні загарадны сезон (гаворка аб здзелках куплі-продажы), як звычайна, пачаўся ранняй вясной. Па даных кадастравага агенцтва, з пачатку года новых уладальнікаў знайшлі больш за паўтысячы летніх домікаў у Мінскай вобласці (без уліку варыянтаў у вёсках), а першыя аб'екты былі прададзены яшчэ ў пачатку студзеня.

СТАР. 4

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Расійскі экспартны цэнтр валодае рэсурсамі і рэзервамі па падтрымцы адносін нашых краін»

Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з яго генеральным дырэктарам

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з генеральным дырэктарам акцыянернага таварыства «Расійскі экспартны цэнтр» Веранікай Нікішынай. Удзел у сустрэчы таксама прынялі пасол Расіі ў Беларусі Барыс Грызлоў і першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, «Расійскі экспартны цэнтр» знаходзіцца на скрыжаванні беларуска-расійскіх адносін, валодаючы пэўнымі рэсурсамі і рэзервамі, у тым ліку адміністрацыйнымі і фінансавымі па падтрымцы адносін дзвюх краін. «Таму мне вельмі важна было з вамі сустрэцца, абгаварыць пытанні. Можа, вы нешта прапануеце. Не магчыма, а дакладна. Вопыт у вас у гэтым плане ёсць. І каб наш галоўны эканаміст у краіне (віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў. — **«Зв.»**) чуў нашу размову і прыклаў мноства намаганняў для падтрымкі напрамкаў нашага супрацоўніцтва», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў работу Веранікі Нікішынай на папярэдняй пасадзе ў Еўразійскай эканамічнай камісіі, дзе яна была членам калегіі (міністрам) па гандлі.

Вераніка Нікішына адзначыла, што ў склад Расійскага экспартнага цэнтра ўваходзіць чатыры кампаніі. Дзве арганізацыі ажыццяўляюць фінансавыя меры падтрымкі, дзве — нефінансавыя меры падтрымкі. «Вядома, улічваючы стратэгічную значнасць гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь для нас, Беларусь — ключавая краіна, у якой мы рэалізоўваем увесь наш арсенал фінансавых і нефінансавых мер у інтарэсах расійскіх і беларускіх кампаній. У выніку і ў інтарэсах нашых эканомік», — сказала яна.

Тавараабарот Беларусі і Расіі ў 2022 годзе склаў 45,76 мільярда долараў ЗША. За студзень—ліпень 2023 года тавараабарот склаў 27,3 мільярда долараў. Расія застаецца нашым асноўным гандлёвым партнёрам, на чыю долю ў студзені—ліпені 2023 года прыйшлося 58,1 працэнта вартаснага аб'ёму знешняга гандлю таварамі.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ У тэму

Тры кірункі супрацоўніцтва

У размове з журналістамі Вераніка Нікішына расказала, што падчас сустрэчы з Прэзідэнтам былі абмеркаваны магчымасці, якія дазволяць стварыць больш спрыяльныя ўмовы для работы беларускіх і расійскіх кампаній. «У цэлым наша супрацоўніцтва і нашы інструменты цяпер сканцэнтраваны па трох кірунках», — сказала яна.

Першым Вераніка Нікішына назвала падтрымку расійскага несыравіннага і неэнергетычнага экспарту ў Беларусь з дапамогай патаннення гэтага экспарту шляхам зніжэння сабекошту і прыняцця мер па пошуку партнёраў. «За 10 гадоў супрацоўніцтва ў гэтым кірунку ў Беларусь з дапамогай такіх мер падтрымкі было пастаўлена расійскага экспарту на больш як 9 мільярдаў долараў», — расказала кіраўнік «Расійскага экспартнага цэнтра».

Другі кірунак супрацоўніцтва з'явіўся ў мінулым годзе, калі мандат пашырыўся на падтрымку імпарту. «Гэта аказанне дапамогі беларускім кампаніям, якія гатовы прапанаваць камплектуючыя, абсталяванне для расійскіх прадпрыемстваў, што ствараюцца з мэтай імпартазамяшчэння і маюць экспартны патэнцыял. Некалькі такіх здзелак мы ўжо ажыццявілі за гэты час па падтрымцы беларускага прыярытэтнага імпарту для Расіі. Мы лічым, што мы толькі на пачатку шляху. І мы з Прэзідэнтам прагаварылі новыя праекты, у якіх мы нашы магчымасці будзем толькі пашыраць», — расказала Вераніка Нікішына.

Трэці кірунак — удзел у вялікіх, важных для Беларусі інвестыцыйных праектах, якія ажыццяўляюцца з дапамогай ільготнага фінансавання. «Мы рады, што шэраг знакавых праектаў з нашым фінансавым удзелам, такіх як мадэрнізацыя «Гродна Азот», ужо рэалізаваны ў Беларусі. Але мы цяпер абмяркоўваем 17 новых інвестыцыйных праектаў, цікавых для кааперацыйнага супрацоўніцтва нашых краін, у якіх мы таксама можам быць карыснымі з пункту гледжання прымянення ўсіх нашых рэсурсаў», — дадала гендырэктар Расійскага экспартнага цэнтра.

Па словах Веранікі Нікішынай, на сустрэчы з беларускім лідарам быў абмеркаваны шэраг іншых магчымасцяў для супрацоўніцтва, пачынаючы ад абмену досведам, найлепшымі практыкамі і заканчваючы скаардынаванымі дзеяннямі па падтрымцы сумеснага экспарту за мяжой. «У нас ужо ёсць такія прыклады, калі нашы страхавыя агенцтвы ажыццяўлялі сумесныя здзелкі па падтрымцы беларускага экспарту на рынку трэціх краін і сумесна вырабленага экспарту. Увесь функцыянал «Расійскага экспартнага цэнтра» мы гатовы перадаваць для выкарыстання нашым беларускім калегам. І гэта таксама адзін з напрамкаў супрацоўніцтва», — адзначыла яна.

Парламенцкі дзённік

Развіваць і ўдасканальваць

Як функцыянуе будаўнічая галіна, і якія змяненні закрануць адзіную дзяржаўную сістэму рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў

На чарговым пасяджэнні 11-й сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання перад парламентарыямі выступіў міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ. У сваім дакладзе кіраўнік ведамства далажыў аб мерах па забеспячэнні ўстойлівага развіцця будаўнічага комплексу краіны, якія прымаюцца.

ПОСПЕХІ І ПРАБЛЕМЫ БУДАЎНІЧАЙ СФЕРЫ

Як адзначыў Руслан Пархамовіч, будаўнічы комплекс Рэспублікі Беларусь адносіцца да ліку галін, якія ўдзельнічаюць у вырашэнні сацыяльных і эканамічных задач развіцця краіны. «Фарміраванне аб'ёмных параметраў будаўніцтва напрамую залежыць ад ступені інвестыцыйнай актыўнасці, — заўважыў ён. — Для яе падтрымання ў бягучым годзе быў прыняты шэраг рашэнняў, якія забяспечваюць дадатковыя крыніцы фінансавання будаўніцтва на агульную суму больш як 3,5 млрд рублёў, што дазволіла загрузіць вытворчы патэнцыял галіны, які ёсць, аднаведна павялічыўшы аб'ёмныя і якасныя параметры будаўнічых арганізацый».

Па словах кіраўніка ведамства, паляпшэнню іх фінансавага стану садзейнічае работа па ўдасканаленні цэнаўтварэння ў будаўніцтве. Прыняты шэраг нарматыўных актаў, нормы якіх накіраваны на больш карэктнае і аб'ектыўнае фарміраванне каштарыснага кошту будаўніцтва аб'екта. «Для забеспячэння дакладнасці цэн на матэрыялы, якія ўключаны ў каштарыс, устаноўлена забарона на выкарыстанне праектнымі арганізацыямі даных самастойнага маніторынгу цэн на матэрыяльныя рэсурсы, — дадаў Руслан Пархамовіч. — З мэтай падтрымання стабільнага эканамічнага становішча і захавання плацежаздольнасці арганізацый ажыццяўляецца рэгуляванне цэн на будаўнічыя матэрыялы шляхам устанаўлення гранічных нарматываў рэнтабельнасці. Акрамя ўтрымання сваіх пазіцый на ўнутраным рынку, працягваецца актыўная работа па аказанні будаўнічых паслуг за мяжой».

Будаўнічая сфера развіваецца, але ёсць і праблемы, якія патрабуюць вырашэння. **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** звярнула ўвагу на даступнасць жылля. Яна нагадала аб патрабаванні, пастаўленым кіраўніком дзяржавы, — цана на квадратны метр павінна быць роўная сярэдняму заробку. Аднак не ўсе забудоўшчыкі прытрымліваюцца гэтага.

Сутыкнулася галіна і з кадравым дэфіцытам рабочых. «З мэтай замацавання ў будаўнічых арганізацыях кваліфікаваных кадраў і недапушчэння іх адтоку прыняты шэраг рашэнняў, накіраваных на павышэнне ўзроўню заработнай платы, — заўважыў міністр. — У выніку заработная плата ў будаўніцтве за восем месяцаў бягучага года склала 1960 рублёў і перавысіла сярэднерэспубліканскі ўзровень практычна на 7 %».

Кажучы аб дэфіцыце кадраў у будаўнічай галіне, Наталля Качанава выказала думку, што толькі павышэннем заробку гэтае пытанне не вырашыць. Па яе меркаванні, будаўнікі павінны быць забяспечаны ўласным жыллём. Акрамя таго, спікер верхняй палаты парламента звярнула ўвагу на прафарыентацыю выпускнікоў школ. Па яе словах, замацаванне кадраў у будаўнічай галіне патрабуе асаблівай увагі: сур'ёзныя прапановы варта ўносіць на заканадаўчым узроўні. «Важна, каб будаўнікі хацелі працаваць у будаўнічай галіне, а не, атрымаўшы адукацыю, сыходзілі ў іншыя кірункі дзейнасці», — рэзюмавала Наталля Качанава.

ПРАВАПАРУШЭННІ — У АДЗІНАЙ СІСТЭМЕ

Падчас пасяджэння члены Савета Рэспублікі прынялі заканапраекты «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў», «Аб змяненні законаў па пытаннях аховы здароўя», «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб каранціне і абароне раслін».

Новаўвядзенні, звязаныя з адзінай дзяржаўнай сістэмай рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў, прадставіў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ.** Ён расказаў, што праектам прадугледжваецца дапаўненне пераліку звестак, якія падлягаюць рэгістрацыі і ўліку ў адзіным дзяржаўным банку даных аб правапарушэннях, інфармацыяй аб пастановах суда касацыйнай інстанцыі. «Замацавана права суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, якія ўдзельнічаюць у выбарах дзелегатаў Усебеларускага народнага сходу, запытваць звесткі аб правапарушэннях пры рэалізацыі норм заканадаўства аб выбарах, — дадаў кіраўнік міліцэйскага ведамства. — З мэтай паляпшэння становішча грамадзян, адміністрацыйныя спагнанні якімі выкананы, у праекце закона вызначана, што тэрмін захоўвання звестак аб адміністрацыйных правапарушэннях пасля выканання асноўнага і дадатковага адміністрацыйных спагнанняў складае тры гады і не можа перавышаць дзесяць гадоў з дня накладання адміністрацыйнага спагнання».

Акрамя таго, праектам прадугледжана выдаленне з адзінага дзяржаўнага банка гэтых звестак пасля вынясення пастановы аб адмене пастановы па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні і спыненні справы, якая ўступіла ў законную сілу. Мяняецца парадак выдачы фізічным асобам звестак аб правапарушэннях у частцы спрашчэння працэдуры падачы заявы аб прадастаўленні выпіскі з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях.

«Згодна з дзеючымі нормамі, упаўнаважаным органам і арганізацыям даюцца звесткі аб прыцягненні асоб да адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці, — паведаміў Іван Кубракоў. — Разам з тым шэраг заканадаўчых актаў прадугледжвае неабходнасць атрымання большага аб'ёму звестак у адносінах да грамадзян. У сувязі з гэтым уносяцца змяненні аб прадастаўленні ва ўстаноўленых выпадках звестак аб учыненні асобамі дзеянняў, за якія яны не былі прыцягнуты да адказнасці па так званых нерэабілітуючых падставах».

Па словах міністра, прыняцце законапраекта дазволіць забяспечыць узгодненасць норм Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў» з палажэннямі іншых заканадаўчых актаў, паўнату ўліку правапарушэнняў; удасканаліць парадак захоўвання і атрымання звестак аб правапарушэннях. Пры гэтым новаўвядзенні не патрабуюць выдзялення дадатковых бюджэтных сродкаў, звязаных з іх рэалізацыяй.

Вераніка КАНЮТА.

Якія яшчэ законапраекты былі разгледжаны сенатарамі падчас пасяджэння, раскажам у заўтрашнім выпуску «МС».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Беларускія грамадзяне пацярпелі ў Ізраілі ад ракетных абстрэлаў

Пра гэта паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі. «У сувязі з рэзкім абвастрэннем сітуацыі ў Ізраілі ў Пасольства Беларусі ў Тэль-Авіве з рознымі пытаннямі звярнулася каля 150 беларускіх грамадзян, двое з якіх — сын і маці — пацярпелі ў выніку ракетных абстрэлаў горада Ашкелона. Абодва пацярпелыя былі шпіталізаваны, ім аказваецца неабходная медыцынская дапамога. Пасольства знаходзіцца ў кантакце з медыцынскай установай і са сваякамі пацярпелых», — заявілі БелТА ў МЗС. Міністэрства рэкамендуе беларускім грамадзянам устрымацца ад паездак у Ізраіль да нармалізацыі становішча. Усім, хто знаходзіцца на тэрыторыі гэтай краіны, рэкамендуецца строга прытрымлівацца ўказанняў службы тылу і мясцовых улад. «Шакаваны інфармацыяй аб колькасці загінулых і параненых. Выказваем спачуванне родным і блізкім пацярпелых», — заявілі ў ведамстве. Беларусь выказала сур'ёзную занепакоенасць у сувязі з рэзкім абвастрэннем сітуацыі ў Ізраілі, якая суправаджаецца чалавечымі ахвярамі, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства замежных спраў. «Лічым непрымальнай любую праяву агрэсіі, а ахвяры сярод мірнага насельніцтва — недапушчальнымі, — падкрэслілі ў МЗС. — Заклікаем бакі супрацьстаяння прыняць тэрміновыя меры для дээскалацыі напружанасці ў рэгіёне». У Беларусі перакананы ў безальтэрнатыўнасці шляху прамых перагавораў для доўгатэрміновага ўрэгулявання палесціна-ізраільскага крызісу.

Колькасць ахвяр землетрасення ў Афганістане перавысіла 2,4 тысячы чалавек

Найбольш пацярпелай стала вясковая тэрыторыя ў акрузе Герата, паведаміла інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа». Паводле даных дырэктара ўпраўлення па барацьбе са стыхійнымі бедствамі правінцыі Герат Маўлаві Ашара, 13 вёсак цалкам разбураны. Як вядома, землетрасенне магнітудай 6,2 адбылося ў Афганістане 7 кастрычніка. Эпіцэнтр — прыкладна за 40 кіламетраў ад горада Герат (лічыцца культурнай сталіцай Афганістана) — адміністрацыйнага цэнтра аднайменнай правінцыі. Ачаг знаходзіўся на глыбіні 10 кіламетраў.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Дзмітрыю Леанідавічу Піневічу, міністру аховы здароўя, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Святы

Хоцімск раздаў падарункі

У суботу тут віншавалі лідараў «Жніва-2023» Магілёўскай вобласці

«Кожны ўносіў свой пасільны ўклад у агульны каравай, — адзначыў падчас урачыстага адкрыцця абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў сяла «Дажынкі-2023» у Хоцімску кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар СЕРГЕЕНКА. — Бачым з якім настроем прыехалі людзі — нягледзячы на такі пахмурны дзень, ва ўсіх свята ў душы. У Хоцімску, гэтым далёкім ад Мінска пасёлку, самым усходнім раёне нашай краіны, адкрыты шэраг новых аб'ектаў сацыяльнага прызначэння... Вось такімі населенымі пунктамі і такімі людзьмі — неабыякавымі да лёсу свайго краю, краіны — прырастае наша беларуская зямля!»

Абноўлены да свята гарадскі пасёлак было не пазнаць. Недахоп сонечных промняў цалкам кампенсавалі гасцінныя падворкі, шчодра аздобленыя сельскагаспадарчай прадукцыяй, прыгажуні і прыгажуны ў нацыянальных строях, майстры са сваімі сімвалічнымі сувенірамі, жыхары са шчаслівымі ўсмешкамі на тварах. Сустракаць такое свята — вялікі гонар для любога сельскагаспадарчага раёна. Пра гэта казаў падчас афіцыйнага адкрыцця старшыня Хоцімскага райвыканкама Георг Мелканян, калі дзякаваў старшыні Магілёўскага аблвыканкама за дапамогу ў падрыхтоўцы райцэнтра да свята. Хоцімск сёлета стаў больш сучасным, зручным і камфортным для жыцця. Як гэта адбывалася, «Звязда» пісала яшчэ ў жніўні. Якраз ішлі апошнія падрыхтоўчыя работы па запуску да Дня ведаў басейна «Каскад». Непасрэдна ў дзень фестывалю дзверы гасцінна расчыніў абноўлены да непазнавальнасці раённы Цэнтр культуры «Мір». Будаўнікі ўцяплілі фасад, паправілі дах, замянілі інжынерныя сеткі. У канцэртнай зале з'явілася сучаснае светлавое і гукавое абсталяванне, абнавіліся гардэроб, санвузлы, грымёркі, пабудавана танцавальная зала. На будынку з'явіўся сімвалічны знак у выглядзе вялікай манеты «Багач» — сімвала багацця і ўрадлівасці. «На сустрэчы з жыхарамі Хоцімскага раёна мяне прасілі, каб мы прывялі Цэнтр культуры ў парадак, — аргументаваў губернатар падчас яго адкрыцця. — Вы прасілі — мы абяцалі і зрабілі. Цэнтр набыў новую афарбоўку, тут ёсць усё неабходнае, каб людзі ладзілі мерапрыемствы, адпачывалі». Рэканструкцыя каштавала болей чым пяць мільёнаў рублёў.

Яркай падзеяй стала шэсце хлебаробаў і цырымонія ўзнагароджання. Адзначаны кіраўнікі раёнаў, гаспадарак, галоўныя спецыялісты, камбайнеры, вадзіцелі, аператары зернесушыльных комплексаў — усе, хто ўнёс значны ўклад у развіццё Магілёўшчыны.

— Поспех прыходзіць да тых, хто мае настойлівасць і добрасумленныя адносіны да справы, — звярнуўся да прысутных Ігар Сергеенка. — Атрыманы нядрэнны ўраджай збожжавых, зернебабовых, рапсу і кукурузы, нарыхтавана дастатковая колькасць кармоў. Стабільна высокія вынікі дэманструюць Горацкі, Шклоўскі, Магілёўскі, Кіраўскі і Бялыніцкі раёны, такія гаспадаркі, вядомыя ў нашай краіне, як «Світанак імя К. П. Арлоўскага», агракамбінат «Зара», калгас «Радзіма», «Газавік-Сіпакова», «Александрыйскае» — вось менавіта гэтыя раёны і гэтыя гаспадаркі, іх кадры з'яўляюцца сёння сапраўдныя маякамі. Школы перадавога вопыту, сельскагаспадарчай вытворчасці, новых тэхналогій, вырашэння ўсіх сацыяльных пытанняў для нашых людзей, якія працуюць і жывуць у сельскай мясцовасці».

Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, якое сёлета стала сапраўдным выпрабаваннем для аграрыяў, Магілёўскай вобласці атрымалася сабраць амаль 900 тысяч тон збожжа і рэкордныя за апошнія гады 110 тысяч тон рапсу (у два разы болей, чым летась). Вырашчаны багаты ўраджай агародніны, цукровых буракоў, лёну, грэчкі. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых склала больш за 25 цэнтнераў з гектара.

На палях вобласці ў перыяд уборачнай кампаніі было задзейнічана амаль чатыры тысячы механізатараў і больш за адну тысячу збожжаўборачных камбайнаў, з якіх амаль 30 працэнтаў перасягнулі мяжу ў намалоце больш як тысячу тон.

Як адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Леанід ЗАЯЦ,** ураджай фарміраваўся ў найцяжэйшых умовах, але прафесійная салідарнасць органаў дзяржаўнага кіравання, аблвыканкама, райвыканкамаў, працаўнікоў гаспадарак, спецыялістаў, трактарыстаў, шафёраў, працаўнікоў сушыльных комплексаў дазволілі дасягнуць высокіх вынікаў.

— Стол у нашага спажыўца будзе багатым, — рэзюмаваў выступоўца. — Гэта павышае прэстыж працы людзей, якія вырашылі звязаць сваё жыццё з сельскай гаспадаркай. Сыты чалавек — спакойны чалавек, а сытае грамадства — спакойнае грамадства.

Сярод раёнаў пальма першынства ў Горацкага раёна. З 28 тысяч гектараў плошчаў збожжавых і зернебабовых атрыманы валавы збор 92 тысячы тон пры ўраджайнасці 33,5 цэнтнера з гектара.

Сярод сельскагаспадарчых і іншых арганізацый першае месца ў сялянскай фермерскай гаспадарцы «Дыяна» Шклоўскага раёна. «Дыяна» вырошчвае збожжавыя, рапс, але асноўны акцэнт робіць на бульбу. Яе тут сёлета накапалі 56 тысяч тон пры ўраджайнасці 520 цэнтнераў з гектара.

Многія аграрыі рэгіёна дасягнулі поспеху не толькі на ўзроўні вобласці. Напрыклад, камбайнеры сельгаспрадпрыемства «Радзіма» Яўген Шалкоўскі і Віктар Васільеў, якія намалацілі звыш 4,5 тысячы тон збожжа, сталі пераможцамі рэспубліканскага конкурсу сярод моладзі.

Сельская гаспадарка, па словах **старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля ІСАЧАНКІ,** — паспяховы бізнес, які ўпэўнена прыцягвае ў сваю дзейнасць найноўшыя тэхналогіі, паспяховыя распрацоўкі аграрнай навукі і кваліфікаваных спецыялістаў.

— На Магілёўшчыне актыўна праводзіцца работа па рэалізацыі і ўкараненні інавацый у сельскую гаспадарку, — падкрэсліў ён. — Асаблівае значэнне надаецца развіццю меліярацыйнага комплексу, што непасрэдна ўплывае на развіццё галіны ў цэлым і стварае спрыяльныя перадумовы для далейшага яго росту, аб чым пастаянна гаворыць кіраўнік дзяржавы. Значны ўклад уносяць інвестары, якія мяняюць аблічча сельскай гаспадаркі, робячы яго сучасным і высокатэхналагічным.

Цікавымі падзеямі фестывалю ў Хоцімску сталі таксама конкурс караваяў і фотаконкурс «Жніво-2023», які сабраў больш за 100 фотаімгненняў сёлетняй уборачнай. Пераможцы фотаконкурсу атрымалі смартфоны, іх работы будуць размешчаны на банерах. Што датычыцца караваяў, то першае месца ў Хоцімскага раёна. Другімі сталі Чэрыкаўскі і Касцюковіцкі, на трэцім месцы — Бабруйскі, Магілёўскі і Клімавіцкі раёны.

А вось самым вялікім уражаннем свята стала катлета ад «Магілёўскага мясакамбіната». Яе даўжыня склала два метры, а вага — 155 кілаграмаў. Пачастунак перадалі ў Хоцімскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота Выдавецкага дома «Шклоў-інфа».

Гаспадарчы падыход

Са стрэльбай ва ўгоддзі,

або Чым прывабліваюць лясы краіны ў плане палявання

У нас штогод прыбаўляецца каля 1,5 тысячы паляўнічых. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі «Адкрыццё паляўнічага сезона ў Беларусі: асаблівасці, тэндэнцыі, прыцягальнасць для турыстычнай сферы» расказаў намеснік дырэктара — начальнік аддзела турызму і рэалізацыі прадукцыі палявання РУП «Белдзяржпаляванне» Аляксандр ІВАНОЎ. У залежнасці ад сезона колькасць паляўнічых або расце, або падае, адзначыў ён. Усяго ў Беларусі прыкладна 96 тысяч паляўнічых.

ШТО КАШТУЕ ТАННА, А ШТО — ДОРАГА?

Пра гэта расказаў **начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандр КАЗАРЭЗ,** нагадаўшы, што ўжо падышоў да канца сезон палявання на трафейных самцоў аленя і лася падчас гону.

«Ён прайшоў нядрэнна. У лесапаляўнічых гаспадарках структуры Міністэрства лясной гаспадаркі здабылі 175 трафейных самцоў аленя і каля 140 трафейных самцоў лася. Гэта найбольш цікавае паляванне для беларусаў і замежнікаў. На сёння ўсе магчымасці для прыняцця паляўнічых існуюць. Улічваючы, што рэсурсы нашы растуць, прапановы па паляванні таксама павялічваюцца, і цэнавая палітыка сёння больш лаяльная. Па сістэме Мінлясгаса сезонная пуцёўка на вадаплаўную дзічыну складае каля Br60, на пушныя віды паляўнічых жывёл, паляванне на якіх стартавала з суботы, — ад Br60 да Br120. Кошт дазволу ў залежнасці ад полу, узросту, віду жывёл складае на казулю Br50—150, на аленя (у залежнасці ад трафейных якасцей) — ад Br500 да Br1,5 тысячы. Добры трафей — гэта кульмінацыя работы паляўнічай гаспадаркі, егераў, паляўніцтвазнаўцаў, таму ён не можа каштаваць танна. На радавыя віды цэны дастаткова даступныя і дэмакратычныя», — расказаў Аляксандр Казарэз.

АДЗІНАЯ ПА КРАІНЕ ЦАНА ПУЦЁЎКІ

Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў знізіла кошт здабычы паляўнічых жывёл і ўстанавіла адзіную цану. БТПР — самы буйны паляўнічы карыстальнік у краіне.

«Штогод у нашых гаспадарках здабываецца каля 5 тысяч ласёў, каля 2 тысяч аленяў і каля 15,5 тысячы казуль. У гэтым годзе было шмат зваротаў з боку паляўнічых, звязаных з памяншэннем кошту палявання для прыцягнення грамадзян. Быў праведзены аналіз, і па шэрагу фактараў у гэтым годзе загадам БТПР зменшаны кошт пуцёўкі на здабычу паляўнічых жывёл, таксама яна стала адзінай па ўсёй краіне. У гаспадарках БТПР паляванне на капытных жывёл для членаў таварыства складае Br15, для тых, хто не знаходзіцца ў БТПР, — Br30. Цана адзіная і змяняцца пакуль не будзе. Таксама прыкладна на 20 працэнтаў зніжаны кошт палявання практычна па ўсіх пазіцыях: лось, алень, казуля. Кошт палявання на трафейных жывёл застаўся ранейшы», — расказаў Сяргей Цябрук.

РЭСУРСНАЯ БАЗА ПАСТУПОВА РАСЦЕ

1 кастрычніка стартавала загоннае паляванне на капытных жывёл. «Яно з'яўляецца найбольш папулярным сярод беларускіх паляўнічых. Рэсурсная база паляўнічай гаспадаркі паступова расце. У гэтым годзе мы налічваем 47,5 тысячы ласёў, што на 1,5 працэнта больш, чым у мінулым годзе, 45,7 тысячы аленяў, што на 9 працэнтаў больш за 2022 год, і амаль 133 тысячы казуль, што на 2,1 працэнта больш, чым летась. Рост колькасці жывёл ідзе, і на гэтай рэсурснай базе будуецца работа ўсіх паляўнічых гаспадарак. Сёлета мы прагназуем узровень здабычы прыкладна на ўзроўні мінулага года, можа, некалькі вышэй. Летась мы здабылі крыху больш за 8,8 тысячы ласёў, каля 6,2 тысячы аленяў і каля 27 тысяч казуль», — адзначыў Аляксандр Казарэз.

Мінлясгас прапрацоўвае пытанне лібералізацыі правілаў палявання, паведаміў ён.

«У нас часта ўзнікаюць праблемы са здабычай недазволенага віду птушак. Калі некалькіх штук, то гэта крымінальная справа. Чалавек, зрабіўшы памылку, становіцца крымінальнікам», — сказаў Аляксандр Казарэз.

Ведамства прапрацоўвае механізмы для пазбягання такіх сітуацый і магчымай дэкрыміналізацыі выпадковых памылак. «Магчыма, мы будзем яшчэ больш дбайна інфармаваць паляўнічых, падключаць Акадэмію навук да гэтых пытанняў, каб выключыць такія факты», — падкрэсліў ён.

УБАЧЫЛІ МЯДЗВЕДЗЯ? НЕ ПРАВАКУЙЦЕ!

Па словах Аляксандра Казарэза, нападаў гэтых жывёл на чалавека з пасляваеннага часу афіцыйна не рэгістравалася. Галоўнае — не правакаваць. Літаральна два-тры тыдні таму быў выпадак у Налібоцкай пушчы, калі ўбачылі мядзведзя, які ішоў уздоўж трасы. Спынілася шмат машын, усе людзі пайшлі фатаграфаваць яго, мядзведзь стаў рабіць папераджальныя выпады. Але людзі ўсё роўна імкнуцца да кантакту з мядзведзем у пагоні за прыгожым кадрам. Гэта буйны і моцны драпежнік, правакаваць яго ні ў якім разе нельга.

Што датычыцца выпадкаў, калі мядзведзі забрыдалі ў населеныя пункты, — гэта часцей за ўсё маладыя асобіны, якія шукаюць новыя месцы пасялення. «Жывёла па няведанні можа заходзіць на тэрыторыю, магчыма, на пах ежы. Таму не трэба пакідаць харчовыя адходы ў не абсталяваных для гэтага месцах, не варта правакаваць яе», — адзначыў Аляксандр Казарэз.

Колькасць мядзведзяў за апошнія гады павялічылася дастаткова моцна. Згодна з сумесным аналізам Мінлясгаса і НАН, у 2022 годзе налічвалася каля 700 мядзведзяў, а каля дзесяці гадоў лічба складала 100—120 асобін. «Такая сітуацыя з мядзведзямі характэрна для ўсяго Паўночнага паўшар'я. Цяпер асноўная папуляцыя ў Беларусі сканцэнтравана ў Віцебскай вобласці, на поўначы Мінскай вобласці, але паступова мядзведзі прыходзяць і ў паўднёвыя раёны — Брэсцкую і Гомельскую вобласці», — расказаў Аляксандр Казарэз.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДОМІК У ВЁСЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Расстаноўка «дачных сіл» сур'ёзна змянілася тры гады таму, — распавядаюць спецыялісты рынку нерухомасці. — Калі раней невялікія аб'екты ў садаводчых таварыствах і вёсках набывалі толькі сапраўдныя прыхільнікі такога роду адпачынку, якія любілі даглядаць зямлю, займацца рамонтам дамоў, збіраць восенню ўраджай, то пасля эпідэміі ковіду шэрагі прыхільнікаў лецішчаў папоўнілі беларусы, якія звычайна з'язджалі на выхадныя і ў адпачынак за мяжу.

Таксама досвед работы на аддалёнцы, недаступны большасці раней, паказаў, што працаваць можна з любой лакацыі. І рабіць гэта (прынамсі, летам) прыемней дзесьці за горадам, чым у чатырох сценах кватэры. Адсюль і цікавасць да лецішчаў з боку тых людзей, якія ніколі і не задумваліся аб прывабнасці загараднага жыцця. Менавіта яны зразумелі каштоўнасць такога роду нерухомасці. І дадалі здзелак у статыстыку.

Прычым, як адзначаюць спецыялісты, істотна рассунуліся часавыя рамкі, калі пакупкі ажыццяўляліся ў асноўным да чэрвеня, каб можна было паспець адгуляць сезон. У гэтым жа годзе цікавасць да такіх метраў не зменшылася нават у верасні.

Можна сказаць, што за апошнія гады попыт на дачы строга сегментаваны: «агароднікі» імкнуцца закрыць здзелкі да красавіка. А тыя, хто разглядае загарадную нерухомасць толькі як месца адпачынку, працягваюць, не спяшаючыся, падбіраць аптымальны варыянт на працягу ўсяго сезона. І нават са спакойнай душой могуць адкласці куплю да наступнага года. Так што цяпер якраз актыўнічае «другая хваля» — людзі, якія не факусіруюцца толькі на градках, а проста з дапамогай дачы імкнуцца разнастаіць сваё жыццё.

Цана адштурхоўваецца ад лагістыкі

Знайсці добрую дачу — задача з нялёгкіх. І ўсё таму, што нашы кашалькі небяздонныя. А так хочацца знайсці «казку» з трох бонусаў: блізка, сучасна і нядорага. Часта пажаданні пакупнікоў не супадаюць з іх магчымасцямі. Прыняцце таго факта, што ты не можаш набыць ідэальную дачу, таксама займае нейкі час. І гэты час пры самастойным пошуку нярэдка расцягваецца на гады.

Пра якія сумы ў асноўным ідзе гаворка? Запыты цяпер вельмі розныя. Самы бюджэтны варыянт — сціплы шчытавы домік на невялікім участку, аддаленым ад МКАД на 50-60 кіламетраў. Прычым размешчаны «дачны цуд» будзе ў «мурашніку»: вакол апынуцца аналагічныя таварыствы на сотні дзялянак, а па лясной дарозе трэба будзе праехаць пяць-сем кіламетраў. Але ж чалавек усё роўна атрымае яднанне з прыродай. Такі варыянт можна знайсці прыкладна за 5 тысяч долараў па курсе.

На выніковы кошт загарадных дамоў па-ранейшаму ўплываюць транспартная даступнасць, блізкасць або наяўнасць інфраструктуры, аддаленасць ад МКАД і напрамак (самыя папулярныя ўжо не змяняюцца — Маскоўскі, Лагойскі, Мядзельскі і Маладзечанскі).

Суадносіны «цана/якасць» залежаць ад запытаў патэнцыяльных пакупнікоў. Хтосьці гатовы ўзяць невялікую дачу танней і перарабіць яе пад сябе. Камусьці трэба менш суседзяў і прасторны двор для дзяцей або хатніх жывёл. Вялікую цікавасць традыцыйна выклікаюць гатовыя да пражывання аб'екты недалёка ад Мінска. І калі вылучаць нейкую заканамернасць, то прадстаўнікі рынку могуць адзначыць некаторае павелічэнне здзелак па куплі-продажы сучасных уладкаваных дамоў у садовых таварыствах, прыдатных для круглагадовага пражывання.

Зрэшты, паводле ацэнак экспертаў, тэндэнцыя налічвае ўжо больш за дзесяць гадоў. Людзі і раней куплялі ўчасткі са старой дачай, зносілі, будавалі вялікія дамы, абсталёўвалі неабходнымі камунікацыямі і бытавой тэхнікай, каб жыць увесь год і ездзіць блізка на работу ў горад. Так кампенсавалася адсутнасць прапаноў з катэджнымі пасёлкамі «ўсё ўключана», якія пачалі з'яўляцца толькі ў апошнія 5-6 гадоў.

Плюсы і мінусы

Калі разглядаць цалкам бюджэтны варыянт, тады трэба шукаць адносна не старую хату (якой не больш 20 гадоў) у звычайных вёсках. Нават самыя моцныя дамы ў такіх населеных пунктах (100—120 кіламетраў ад сталіцы) будуць прадавацца ў некаторых выпадках да 3-5 тысяч долараў. Адкрыта слабенькія будынкі каштуюць на парадак танней. Мэтавая аўдыторыя ў гэтых аб'ектаў зусім розная, паколькі ў кожнага варыянта свае плюсы і мінусы.

Дом у вёсцы выберуць людзі, якія любяць прастор (участкі адназначна большыя), якіх не раздражняе неабходнасць пастаянна абкошваць вялікія плошчы і якія, хутчэй за ўсё, хочуць весці нейкую гаспадарку і гатовыя мірыцца з тым, што вёска можа быць зусім маланаселенай, а нешматлікія карэнныя жыхары — пажылыя людзі. Акрамя гэтага, у вёсках, як правіла, прасцей ідуць справы з падводам камунікацый.

Але попыт на «недаробленыя» дамы, якія размешчаны ў вёсках, усё ж такі ёсць. Часта такія аб'екты купляюць пад знос: на першым месцы — маляўнічая прырода і вялікі ўчастак. Зрэшты, з-за таго, што будоўля займае час, а выдаткі на будматэрыялы патрабуюць грошай, цікавасць да такіх здзелак апошнім часам памяншаецца. Патэнцыяльныя пакупнікі ў гэтым сегменце ўсё ж чакаюць або прыглядаюцца да гатовых загарадных хатак, якія прыдатныя для круглагадовага пражывання. Яны могуць быць размешчаны як у садаводчых таварыствах, так і ў вёсках.

У апошнім выпадку ва ўлік бярэцца, наколькі буйны населены пункт, як часта там расчышчаюцца дарогі ў непагадзь. Пакуль немалы плюс у тым, што тарыфы на тую ж электрычнасць у глыбінцы ніжэй, няма членскіх узносаў за кааператыў, звычайна непадалёк ёсць крама або прыязджае аўталаўка.

За выгоды трэба плаціць дадаткова

Наступны крок у дачнай градацыі — больш дыхтоўны дом і больш прасторны ўчастак. Як правіла, гаворка ідзе пра будынкі, якія можна добра прапаліць нават ранняй вясной. Такія аб'екты ў асноўным купляюць для бацькоў, якія мараць увесь сезон праводзіць за горадам.

Да іх ужо па меры магчымасці будуць наведвацца дзеці-ўнукі. Даступнасць крам, візіты дачнай крамы тут адыгрываюць вялікую ролю. Ідэальна, калі на ўчастку будзе яшчэ і лазня. Для такога аб'екта ў запасе трэба мець каля 15 тысяч долараў у эквіваленце.

Як толькі ў аб'яве з'яўляецца слова «выгоды», цана адразу ўзлятае. Калі яшчэ і ўчастак знаходзіцца ў 30-кіламетровай зоне ад Мінска, то без 20 тысяч долараў па курсе дом можна нават не шукаць. Пры гэтым патэнцыяльныя пакупнікі, якія валодаюць такой сумай, хочуць, каб дом быў блочны або цагляны.

Каля сталіцы

У апошнія месяцы колькасць здзелак куплі-продажу дамоў пад Мінскам чакана скарацілася, а вось прапанова вырасла. Сучасныя хаты трохі падаражэлі, а дачы трохі патаннелі.

Напрыканцы лета рынак загараднай нерухомасці папоўніўся новымі аб'ектамі, колькасць якіх за месяц павялічылася на 2,2 %. Такім чынам, агульная колькасць выстаўленых на продаж аб'ектаў склала 9,3 тысячы, што на 13 % больш, чым у мінулым годзе.

Практычна ва ўсіх сегментах прыток аб'ектаў на рынак перавышаў іх адток. У найбольшай меры гэта закранула недабудаваныя дамы — іх стала больш на 3 %. Рост прапановы старых і сучасных дамоў склаў 2 %, колькасць дач стала большай на 1,5 %.

У разрэзе напрамкаў прапанова павялічылася ва ўсіх выпадках. Істотней за ўсё на Слуцкім — плюс 5 %. Крыху менш (плюс 3-4 %) — на Магілёўскім, Ракаўскім і Мядзельскім напрамках.

Па папярэдніх даных, агульная колькасць здзелак з дамамі ў Мінску і Мінскай вобласці ў апошнім месяцы лета склала 731, што на 13 % менш, чым у мінулым месяцы.

У Мінскім раёне колькасць заключаных здзелак за месяц таксама знізілася: было набыта 124 дамы, што на 19 % менш. У найбліжэйшых раёнах за месяц колькасць здзелак скарацілася на 3 % і склала 335. Да найбліжэйшых адносяцца Лагойскі, Пухавіцкі, Смалявіцкі, Дзяржынскі, Уздзенскі, Маладзечанскі, Вілейскі і Валожынскі раёны.

Дынаміка цэн была рознанакіраваная. Рост адзначаўся ў сегменце ўчасткаў і сучасных дамоў — плюс 0,6 %. Танней за месяц сталі недабудаваныя хаты (мінус 2 %) і дачы (мінус 0,3 %).

Самы дарагі дом, набыты ў жніўні гэтага года, размяшчаецца ў аграгарадку Ждановічы. Побач сасновы лес, Мінскае мора, вадасховішча Дразды і Заслаўскае. Дом 1962 года пабудовы стаіць на ўчастку 15 сотак. Абышоўся ён пакупніку ў 450 тысяч долараў.

Па сезоне

На сёння ўжо і блізкасць работы не заўсёды мае значэнне, многія багатыя кліенты перайшлі на аддалены трафік. Але для людзей можа быць важная магчымасць хутка дабрацца да бытавой і сацыяльнай інфраструктуры, якой максімальна напоўнены Мінск і абласныя цэнтры.

У аўтсайдарах продажаў даўно і, падобна, надоўга закансерваваныя недабудаваныя дамы і дачы, асабліва калі ў іх некалькі паверхаў. Людзі пачалі разумець, што «палацы» ім не патрэбныя і з функцыянальнага, і з эканамічнага пункту гледжання.

Рынак загараднай нерухомасці мае відавочны сезонны складнік. Ён актыўны, жывы механізм, які добра працуе ў апошнія два гады. Цэны тут ужо не падаюць. «А змены ў Кодэксе аб зямлі, якія з 2023-га спрасцілі парадак куплі ўчасткаў замежнікамі, могуць узмацніць попыт за кошт пакупнікоў з Расіі», — звяртаюць увагу эксперты. А дадатковая цікавасць гэтай аўдыторыі, магчыма, прывядзе да павышэння цэн ужо ў гэтым годзе.

Глыбокай восенню і зімой, па словах экспертаў, загарадныя дамы прапануюць танней. Але, па-першае, выбар не такі вялікі з-за жадання прадаўцоў прытрымаць свае аб'екты да піку попыту. Па-другое, не ўсе заганы можна ўбачыць, напрыклад, пад снегам. З іншага боку, летам нельга праверыць загараднае жыллё на прадмет ацяплення, наяўнасці волкасці або прамярзання вады ў трубах. Так што, выбіраць, калі купляць, павінен кожны будучы ўласнік самастойна.

Сяргей КУРКАЧ.

Надвор'е

МОЦНЫ ВЕЦЕР ПЛЮС ДОЖДЖ З МОКРЫМ СНЕГАМ...

Але бліжэй да выхадных пацяплее месцамі да 24 градусаў

Вернемся да мінулых выхадных, якія ў нас аказаліся вельмі ветранымі: у большасці раёнаў краіны вецер узмацняўся да 15—20 м/с, а месцамі і да 24 м/с. Паводле інфармацыі сіноптыкаў, максімальныя парывы зафіксавалі метэастанцыя Горкі, дзе днём 7 кастрычніка вецер узмацняўся да 25 м/с, а таксама метэастанцыя Слуцк — днём 8 кастрычніка — 28 м/с. Акрамя таго, у мінулую нядзелю істотна пахаладала і ў асобных раёнах краіны, у тым ліку ў сталіцы, адзначаўся першы мокры снег. Пасля па-летняму цёплага верасня гэта было сапраўды рэзка.

І далей, ужо на гэтым тыдні, у нас у краіне па-ранейшаму захаваецца няўстойлівы характар надвор'я. Пад уплывам атмасферных франтоў і няўстойлівых паветраных мас у большасці дзён чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у пачатку тыдня месцамі магчымы мокры снег. Пры гэтым будзе ветранае надвор'е з парывамі да 15—20 м/с, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак месцамі, а ноччу па паўночным усходзе на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Максімальная тэмпература паветра днём складзе ад 6 цяпла да плюс 12 градусаў.

У сераду ноччу будзе пераважна без ападкаў, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы. Днём месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 1 да плюс 5 градусаў, месцамі замаразкі ад 0 да мінус 4 градусаў. Днём слупкі тэрмометра пакажуць плюс 8—14 градусаў, а па захадзе — плюс 15—17 градусаў.

Досыць вільготнае надвор'е абяцаюць сіноптыкі і ў чацвер. Пачне цяплець, на большай частцы краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу месцамі, раніцай і днём у многіх раёнах вецер узмоцніцца да 15—20 м/с. Ноччу тэмпература будзе ў межах ад плюс 6 градусаў па паўночным усходзе да плюс 14 градусаў па захадзе, а днём — ад плюс 12 да плюс 19 градусаў.

У пятніцу ноччу месцамі па паўночным усходзе краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы, днём будзе пераважна без ападкаў. У начныя гадзіны ў асобных раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Уначы — плюс 2—8 градусаў, а ўдзень — плюс 8—15 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах будзе ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3—9 градусаў. Днём паветра прагрэецца ад плюс 13 градусаў па паўночным усходзе да плюс 24 градусаў па паўднёвым захадзе. У нядзелю ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы сіноптыкі абяцаюць плюс 6—13 градусаў, удзень — ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, а па паўднёвым усходзе месцамі да 18 цяпла.

Ну што, у сярэдзіне кастрычніка чакаем у госці бабіна лета?

Сяргей КУРКАЧ.

З УВАГАЙ ДА ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ

Патрыятычныя, культурныя, інвестыцыйныя праекты — у скарбонцы Калінкавіцкага раёна

Месца памяці адной з самых трагічных старонак Гомельшчыны падчас Вялікай Айчыннай вайны і сімвал адлюстравання маштабу трагедыі генацыду беларускага народа — усё гэта аб мемарыяльным комплексе на месцы фашысцкага лагера смерці на тэрыторыі гарадскога пасёлка Азарычы, што ў Калінкавіцкім раёне. Гэты рэгіён у цэнтры Гомельшчыны — надзвычай цікавы шэрагам знакавых для краіны аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Для раёна гэта гонар і вялікая адказнасць. Пра тое, як удаецца выкарыстоўваць багатую гістарычную спадчыну для развіцця турыстычнага патэнцыялу тэрыторыі і не толькі, карэспандэнт «Звязды» пацікавілася ў старшыні Калінкавіцкага раённага выканаўчага камітэта Сяргея ГВАЗДЗЯ.

— Азарычам пашасціла быць уключаным у план комплекснага добраўпарадкавання населеных пунктаў Гомельшчыны. На працягу некалькіх месяцаў не спыняецца маштабная работа па рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу ў памяць вязняў Азарыцкага лагера смерці. Аднак максімальная ўвага не толькі да зоны мемарыяла, але і тэрыторыі ўсяго гарпасёлка. Раскажыце, калі ласка, якія сацыяльна значныя пераўтварэнні перажываюць Азарычы?

— Як вядома, падчас комплекснага добраўпарадкавання населеных пунктаў у цэнтры ўвагі заўжды развіццё сацыяльна значнай інфраструктуры. Гэта і медэрнізацыі сацыяльных аб'ектаў, вырашэнне пытанняў водазабеспячэння, асвятлення і ацяплення, дарожнай сеткі, капітальнага рамонту. У Азарычах сёння пражывае звыш 1200 чалавек. Працуюць дзіцячы садок і сярэдняя школа, якія наведваюць звыш 230 дзяцей. Ёсць і свая бібліятэка, аддзяленне сувязі, цэнтр вольнага часу, бальніца, дом-інтэрнат для састарэлых і людзей з інваліднасцю. Кардынальныя змены і абнаўленні закранулі ўсе аб'екты інфраструктуры і жыллёвы фонд гарпасёлка. Комплекснае добраўпарадкаванне Азарычаў пачалося ў жніўні мінулага года з рэканструкцыі дома-інтэрната для састарэлых і людзей з інваліднасцю. Была праведзена маштабная работа. У бягучым годзе сярод абноўленых сацыяльна значных аб'ектаў — будынак цэнтра вольнага часу, які доўгі час знаходзіўся ў аварыйным стане. Акрамя таго, праведзены рамонт мясцовых дзіцячага садка і школы, паліклінікі Азарыцкай бальніцы. Вялікая работа праведзена і па добраўпарадкаванні тэрыторыі медустановы. Яшчэ адзін сацыяльны аб'ект, якому ўдзелена ўвага, — пасялковая бібліятэка 1953 года пабудовы. Але ўсё ж самая важная падзея, якую цяпер перажываюць Азарычы, — маштабнае добраўпарадкаванне і рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці. Гэта адно з самых знакавых месцаў патрыятычнага турызму на Гомельшчыне. У абноўленым мемарыяльным комплексе будзе адкрыты першы ў краіне помнік ваенным медыкам. Нагадаю, што на ўвасабленне ў жыццё гэтага сапраўды народнага патрыятычнага праекта накіраваны сродкі, сабраныя ў рамках абласнога і рэспубліканскага суботнікаў. Галоўным архітэктарам праекта выступае адзін з лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне» за стварэнне мемарыяльнага комплексу «Ала» ў Светлагорскім раёне Сяргей Пярвіцкі. На аб'екце скончаны асноўныя бетонныя работы, а да канца кастрычніка будзе цалкам завершана добраўпарадкаванне і аддзелачныя работы. Маштабную рэканструкцыю знакавага месца памяці плануем завяршыць у лістападзе бягучага года.

— Сяргей Аляксандравіч, Калінкавіцкі раён сапраўды ўнікальны сваімі аб'ектамі гісторыка-культурнай спадчыны. Як удаецца выкарыстоўваць іх у развіцці турыстычнага патэнцыялу раёна? Ці ёсць цікавасць прыватнай ініцыятывы ў гэтай сферы?

— У турыстычны маршрут «Залатое кальцо Гомельшчыны» ўключаны брэнд нашага раёна — аграгарадок Юравічы. Юравіцкі кірмаш маляўніча апісаў у сваім рамане «Людзі на балоце» Іван Мележ. Цікавы факт: дзед класіка

беларускай літаратуры Фёдар Мележ у 1890—1898 гадах быў валасным старшынёй у Юравічах. Жыхары нашага раёна ганарацца гэтай тэрыторыяй, дзе, дарэчы, знаходзяцца 18 унікальных помнікаў археалогіі. Сярод іх — знаёмая кожнаму са школьнага падручніка гісторыі, найстаражытнейшая ў Беларусі стаянка першабытнага чалавека. Помнік археалогіі «Аркеалагічны комплекс «Юравічы»: познепалеалітычная стаянка і старажытны горад перыяду Сярэднявечча» ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь з прысваеннем катэгорыі «1» гісторыка-культурнай каштоўнасці. У 2021 годзе тут адкрыты музей пад адкрытым небам. Завяршыць будаўніцтва музея, распачатае ў 2004 годзе, удалося дзякуючы сродкам, выдзеленым з рэспубліканскай і абласной інвестыцыйных праграм. Толькі ў бягучым годзе «Музей пад адкрытым небам — стаянка першабытнага чалавека» аг. Юравічы Калінкавіцкага раёна» наведала амаль дзве тысячы гасцей. Дарэчы, гісторыка-культурныя аб'екты раёна актыўна рэкламуем на турыстычных выставах краіны, вітаем прыватную ініцыятыву, у тым ліку па вырабе і продажы сувенірнай прадукцыі.

Знакамітасць Юравічаў — помнік архітэктуры позняга барока ў Беларусі, комплекс былога калегіума езуітаў і касцёл XVIII стагоддзя (цяпер гэта Свята-Раства-Багародзічны мужчынскі манастыр Беларускай праваслаўнай царквы). Тут захоўваецца хрысціянская святыня — цудатворны абраз Божай Маці-Міласэрная-Юравіцкая. Кожны год вернікі здзяйсняюць хрэсныя хады з цудатворным абразом. Доўгачаканая работа па аднаўленні гэтага знакавага месца нашага раёна пачалася ў 2007 годзе і фінансавалася ў рамках Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы і інвестыцыйнай праграмы Гомельскай вобласці.

Рэстаўрацыя храма, манастырскіх будынкаў, брамы і агароджы з вежамі была завершана ў мінулым годзе. Сёння гэты ўнікальны гістарычны аб'ект цяжка пераацаніць у плане развіцця беларускага рэлігійнага турызму.

— Сяргей Аляксандравіч, сёлета раён чарговы раз прымаў удзельнікаў Рэспубліканскага фестывалю народнага гумару «Аўцюкі-2023». Ад кіраўніцтва рэгіёна ў ваш адрас прагучалі словы падзякі за захаванне і папулярызацыю свята як сапраўднага брэнда Гомельшчыны.

— Мы ўдзячныя Гомельскаму аблвыканкаму і Міністэрству культуры Беларусі за ўвагу і падтрымку гэтага свята на Калінкавіцкай зямлі. Перакананы, што Рэспубліканскі фестываль народнага гумару «Аўцюкі» — самы пазітыўны форум краіны. Ён дае магчымасць усім ацаніць народны гумар. Сёлета наш раён прымаў свята ўжо ў 11-ы раз. Як заўсёды, яно прайшло ярка і маляўніча. Удзел прынялі дэлегацыі усіх абласцей краіны. Яны спаборнічалі ў жанры гумарыстычнага стэндапу, тэатры мініяцюр, інструментальным конкурсе, гумарыстычным касцюме. Прайшло ўрачыстае адкрыццё памятнага знака «Аўцюкоўская кветка», падрыхтавалі вуліцы тэматычных падворкаў, насычаную канцэртную праграму, а таксама правялі «Малыя аўцюкоўскія гульні». Лічу, што папулярнасць фестывалю — брэнда Калінкавіцкага раёна — у тым, што гэта свята вынаходлівасці, жыццялюбства беларускага народа.

— Сёння перад раёнамі ў рэгіёнах стаіць задача рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты. Што ў гэтым плане можа прапанаваць Калінкавіцкі раён?

— Сапраўды, такая задача пастаўлена кіраўніком дзяржавы перад рэгіёнамі і цяпер нашым раёнам выканана. Рэалізаваны інвестыцыйны праект па рэканструкцыі вытворчага цэха з пабудовай цэха вытворчасці харчовых прадуктаў на аснове другаснай малочнай сыравіны на Сумесным таварыстве з абмежаванай адказнасцю «БЕЛСЫР». Гэты інвестыцыйны праект стартаваў у 2020 годзе, а ў ліпені бягучага года ўжо ўведзены ў эксплуатацыю новы цэх вытворчай магутнасцю 22 тоны прадукцыі ў суткі. Агульны аб'ём інвестыцый у асноўны капітал па праекце склаў звыш 50 мільёнаў рублёў. На экспарт плануецца рэалізоўваць да 90 працэнтаў прадукцыі. Гэты праект значны не толькі для Калінкавіцкага раёна, але і ўключаны ў пералік значных інвестпраектаў Гомельскай вобласці.

Самы буйны інвестыцыйны аб'ект вытворчага будаўніцтва ў сельскай гаспадарцы на сёння ў нашым раёне — узвядзенне малочнатаварнай фермы больш чым на 800 галоў у ААТ «Прудокскае». На новай ферме ўмовы ўтрымання жывёлы, сістэма кармлення, паення і даення будуць поўнасцю адпавядаць сучасным патрабаванням. Будаўніцтва фінансуецца са сродкаў абласнога бюджэту. Кошт будаўніча-мантажных работ складае каля 10 мільёнаў рублёў. Будаўніцтва новай фермы, якое пачалося ў канцы мінулага года, цяпер у фінальнай стадыі. Завяршаюцца пусканаладачныя работы і ў будынку, дзе будзе размяшчацца даільна-малочны блок. Увогуле, новая вытворчасць дазволіць гаспадарцы выйсці на новы ўзровень, павялічыць рост прадукцыі жывёлагадоўлі і яе якасць.

Адзначу таксама інвестыцыйныя праекты ў сферы вытворчасці, якія рэалізаваны прадпрыемствамі прыватнай формы ўласнасці. Сярод іх — стварэнне вытворчасці па перапрацоўцы пластмас прадпрыемствам «Владиангец» і вытворчасць хлебабулачных вырабаў прадпрыемствам «ЛибераБейк». Гэтыя праекты таксама вельмі важныя для раёна, бо дазваляюць стварыць новыя рабочыя месцы. А за гэтым — і рост дабрабыту жыхароў нашага раёна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Памяць

80 ГАДОЎ ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

Гарадскі пасёлак Лёзна ў гады Вялікай Айчыннай вайны стаў першым райцэнтрам на Віцебшчыне, які Чырвоная Армія вызваліла ад ворага. Прарваць умацаваныя пазіцыі нямецкіх акупантаў атрымалася 8 кастрычніка 1943 года, жорсткія баі за гэтую зямлю працягваліся да 10 кастрычніка.

Фота БелТА.

Урачыстыя мерапрыемствы напярэдадні знакавай даты пачаліся з шэсця пакаленняў, у якім узялі ўдзел каля дзвюх тысяч чалавек. Кіраўніцтва паўночнага рэгіёна, прадстаўнікі арганізацый і працоўных калектываў, грамадскіх аб'яднанняў і моладзь прайшлі па цэнтральнай вуліцы Леніна, многія — з партрэтамі сваіх герояў-вызваліцеляў. На цэнтральным воінскім пахаванні адбыўся мітынг у гонар салдат і афіцэраў, якія змагаліся за незалежнасць раёна. Менавіта ў Лёзне ў паўночным рэгіёне далі старт святочным падзеям, звязаным з 80-й гадавінай вызвалення Віцебшчыны.

«Болем у сэрцы адгукаецца памяць аб загінулых на фронце і закатаваных акупантамі мірных жыхарах. Тысячы воінаў, сыноў розных народаў былога Савецкага Саюза вызвалялі Лёзненшчыну. Больш за 32 тысячы з іх навечна засталіся ў гэтай зямлі. Пошукавыя атрады ўсё яшчэ знаходзяць новыя пахаванні загінулых герояў, устанаўліваюць іх імёны. Дзеючая армія, фронт, тыл, партызанскія брыгады імя Данукалава і «Лёзненская» — усюды ваявалі ўраджэнцы Лёзненскага краю. Пяцёра — Іван Авекаў, Цімафей Горнаў, Ігнат Мацкевіч, Сяргей Чарапнёў, Іван Янушкоўскі — былі ўдастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. А двое — Віктар Ландычэнка і Пётр Саўцін — сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы. Амаль дзве тысячы ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі», — адзначыў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.** Ён падзякаваў ветэранам, пакаленням працаўнікоў лёзненскай зямлі, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё рэгіёна.

У рамках святкавання гарпасёлкам 80-годдзя з дня вызвалення базавай школе № 2 прысвоілі імя лётчыка, Героя Савецкага Саюза Івана Авекава. Лётчыкам 252-га знішчальнага авіяцыйнага палка ён стаў у 21 год. Адпраўляўся ў разведку з паветра, штурмаваў аўтакалоны і аэрадромы праціўніка, ахоўваў паветраную прастору і суправаджаў у тыл ворага айчынныя бамбардзіроўшчыкі і штурмавікі. На рахунку капітана да сакавіка 1942-га было ўжо 178 баявых вылетаў. Камандзір авіяцыйнай эскадрыллі капітан Іван Авекаў загінуў у авіякатастрофе 17 красавіка 1943 года ў Ліпецкай вобласці. Пахаваны ў брацкай магіле ў горадзе Данкове. Памяць аб бясстрашным лётчыку захоўвае калектыў школы. У музейнай экспазіцыі герою прысвечаны асобны стэнд, а цяпер на сцяне ўстановы адукацыі з'явілася мемарыяльная дошка ў яго гонар. Нашчадкаў Авекава ўдалося знайсці ваеннаму кіраўніку ўстановы па інтэрнэце: сваякі расказалі інтэрв'ю ў відэаматэрыялах пра лётчыка. Яны перадалі ў школьны музей фотаздымкі і ўзнагародныя лісты.

«У нашым раёне правядзіцца вельмі вялікая работа па ўвекавечанні памяці нашых герояў. Лёзненская зямля багатая на знакамітых землякоў. Іх імёны ўвекавечаны на Алеі славы ў самым цэнтры гарадскога пасёлка. Імёны кіраўнікоў, якія дасягнулі высокіх вытворчых паказчыкаў, сёння ўвекавечаны на адміністрацыйных будынках», — падкрэсліў **старшыня Лёзненскага райвыканкама Іван ФЁДАРАЎ.**

Часткай свята стаў і міжнародны маладзёжны форум, які стартаваў з аўтапрабегу. Удзельнікаў праекта ад Беларусі і Расіі аб'яднаў адкрыты дыялог, падчас якога былі падпісаны рэгіянальныя дагаворы аб супрацоўніцтве.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»
220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована на сайте ОАО «Белгазпромбанк»
www.belgazprombank.by

Форма 1

Бухгалтерский баланс 30 сентября 2023 г.

ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	Пункт приме-чаний	2023 год	2022 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		204 915	122 777
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		2 176	305
4	Средства в Национальном банке	1103		303 042	533 479
5	Средства в банках	1104		508 244	367 706
6	Ценные бумаги	1105		875 865	880 071
7	Кредиты клиентам	1106		2 594 535	1 962 438
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		1 364	1 049
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		238 078	246 344
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		7 215	7 479
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		7 844	6 372
13	Отложенные налоговые активы	1112		-	-
14	Прочие активы	1113		78 683	32 250
15	**ИТОГО активы**	**11**		**4 821 961**	**4 160 270**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
17	Средства Национального банка	1201		131	-
18	Средства банков	1202		515 192	834 827
19	Средства клиентов	1203		3 298 702	2 395 456
20	Ценные бумаги банка	1204		33 624	22 079
21	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
23	Прочие обязательства	1207		31 659	21 148
24	ВСЕГО обязательства	120		3 879 308	3 273 510
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
26	Уставный фонд	1211		348 161	348 161
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		186 450	166 147
29	Фонды переоценки статей баланса	1214		99 153	69 998
30	Накопленная прибыль	1215		308 889	302 454
31	ВСЕГО собственный капитал	121		942 653	886 760
32	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**4 821 961**	**4 160 270**

Форма 2

Отчет о прибылях и убытках за 1–3-й квартал 2023 г.

ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	Пункт приме-чаний	2023 год	2022 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		213 726	224 691
2	Процентные расходы	2012		90 093	110 542
3	*Чистые процентные доходы*	201		123 633	114 149
4	Комиссионные доходы	2021		116 388	95 550
5	Комиссионные расходы	2022		36 972	27 356
6	*Чистые комиссионные доходы*	202		79 416	68 194
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		541	185
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		2 277	18
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		43 551	68 867
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207		22 115	57 772
12	Прочие доходы	208		13 055	18 331
13	Операционные расходы	209		136 603	129 405
14	Прочие расходы	210		3 602	4 439
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		100 153	78 128
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		13 739	10 178
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**86 414**	**67 950**

Председатель Правления И.О. Потапова

Главный бухгалтер Н.А. Самусевич

Дата подписания: 3 октября 2023 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8
выдана Национальным банком Республики Беларусь 17.04.2023.
УНП 100429079

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 19 октября 2023 г. в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов

ЛОТ № 1. КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА (АВТОТРАКТОРНЫЙ ЦЕХ) В СОСТАВЕ:

№ п/п	Наименование основных средств	Инв. №	Дата ввода в эксплуатацию	Основные технические и эксплуатационные характеристики
1	Автотракторный цех, пристройка – административный, пристройка – бытовка, пристройка – аккумуляторная, в том числе:			Площадь 1114 м², кирпичное, объем здания 4504 м³, крыша совмещенная рулонная, шиферная
	Здание автотракторного цеха с пристройкой – бытовкой, пристройкой – аккумуляторной	00110053	Декабрь 1948	
	Здание административное, инв. № кап. стр. 730/С-279, г. Кричев	00110179	Декабрь 2007	
2	Здание боксов для хранения техники с топочным отделением	00110256	Декабрь 2010	Площадь 407,1 м², кирпичное, объем здания 2800 м³, крыша металлопрофиль, в топочной шиферная
3	Металлический навес для стоянки автомобилей, инв. № кап. стр. 730/С-346	00110125	Декабрь 1979	Навес стойки металл, крыша шиферная, площадь 535,05 м², объем 1822 м³
4	Навес для дров	00110257	Декабрь 2010	Навес, стены ж/б плиты, сетка, крыша шиферная, площадь 47,1 м², объем высота 2,8 м
5	Навес для стоянки автомобиля, инв. № кап. стр. 730/С-13600	00110233	Июль 2009	Навес, стены шифер, крыша шиферная, площадь 84,14 м², объем 449 м³
6	Охранный пункт	00110112	Август 2004	Кирпичное здание пункта охраны, 2 этаж
7	Ограждение к автотракторному цеху, инв. № кап. стр. 730/С-13299	00220084	Август 2004	
8	Площадка бетонная, инв. № кап. стр. 730/С-13222, г. Кричев, ул. Зеленая, 4	00220131	Декабрь 2007	Бетонная площадка 15,2 х 21,1 м
9	Трансформаторная подстанция	00110132	Декабрь 1962	Трансформаторная подстанция
10	Насаждения ограниченного пользования	00970253	Июль 2010	Деревья, кустарники
11	Котел стальной твердотопливный	00540159	Август 2009	Отопительный котел
12	Котел стальной твердотопливный	00540158	Август 2009	Отопительный котел
13	Трансформатор ТМГ11-1250/10У1	00540165	Октябрь 2009	Силовое электрооборудование
14	Трансформатор ТМГ11-1250/10У1	00330231	Октябрь 2009	Силовое электрооборудование
15	Кабельные линии электропередачи ЦРП-2 до ТП-7 (сырьевой)	00540165	Август 2011	Линии электропередачи
16	Подстанция ТП-7	00540018	Декабрь 1963	Силовое электрооборудование
17	Электроводонагреватель ЭВА-450/15	00445319	Ноябрь 2011	Нагреватель воды

Начальная цена продажи лота № 1 снижена на 40 % и составляет с учетом НДС (20 %): 139 111,20 (Сто тридцать девять тысяч сто одиннадцать белорусских рублей 20 копеек), задаток 13 911,12 (Тринадцать тысяч девятьсот одиннадцать белорусских рублей 12 копеек).

ЛОТ № 2. КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА (ЦЕХ КИПиА) В СОСТАВЕ:

№ п/п	Наименование основных средств	Инв. №	Дата ввода в эксплуатацию	Основные технические и эксплуатационные характеристики
1	Здание КИПиА, инв. № кап. стр. 730/С-343, г. Кричев	00110063	Декабрь 1965	Крыша рулонная, водопровод, центральное отопление
2	Бассейн декоративный	00220196	Декабрь 2007	Бетонный оштукатуренный бассейн с распылителем, 1 м³
3	Насаждения ограниченного пользования	00970252	Июль 2010	Деревья, кустарники

Начальная цена продажи лота № 2 снижена на 40 % и составляет с учетом НДС (20 %): 71 568,00 (Семьдесят одна тысяча пятьсот шестьдесят восемь белорусских рублей 00 копеек), задаток 7 156,80 (Семь тысяч сто пятьдесят шесть белорусских рублей 80 копеек).

ЛОТ № 3. КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА (ЗДРАВПУНКТ) В СОСТАВЕ:

№ п/п	Наименование основных средств	Инв. №	Дата ввода в эксплуатацию	Основные технические и эксплуатационные характеристики
1	Здание здравпункта (цех здоровья), инв. № кап. стр. 730/С-183, г. Кричев	00110082	Декабрь 1979	Площадь 258,76 м², кирпичное, объем здания 1183 м³, крыша рулонная, водопровод, центральное отопление
2	Насаждения ограниченного пользования	00970254	Июль 2010	Деревья, кустарники

Начальная цена продажи лота № 3 снижена на 40 % и составляет с учетом НДС (20 %): 14 616,00 (Четырнадцать тысяч шестьсот шестнадцать белорусских рублей 00 копеек), задаток 1 461,60 (Одна тысяча четыреста шестьдесят один белорусский рубль 60 копеек).

ЛОТ № 4. КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА (ИСПЫТАТЕЛЬНЫЙ ЦЕНТР) В СОСТАВЕ:

№ п/п	Наименование основных средств	Инв. №	Дата ввода в эксплуатацию	Основные технические и эксплуатационные характеристики
1	Здание лаборатории испытательного цеха, инв. № кап. стр. 730/С-288, г. Кричев	00110064	Декабрь 1960	Площадь 483,75 м², кирпичное, объем здания 2254 м³, крыша совм. рулонная, водопровод, центральное отопление
2	Склад кислоты, инв. № кап. стр. 730/С-438, г. Кричев, ул. Зеленая	00110130	Декабрь 2004	Площадь 10,59 м², кирпичное, объем 43 м³, крыша шиферная, окна

Начальная цена продажи лота № 4 снижена на 40 % и составляет с учетом НДС (20 %): 20 448,00 (Двадцать тысяч четыреста сорок восемь белорусских рублей 00 копеек), задаток 2 044,80 (Две тысячи сорок четыре белорусских рубля 80 копеек).

Собственник имущества: Открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудский с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.

Организатор торгов: Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1. www.mogilev.cci.by

Место проведения торгов: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лоты №№ 1–4 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность – представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.

Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся в 19 октября 2023 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112.

Последний срок подачи заявления – 18 октября 2023 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов – **19 октября 2023 г. с 13.30 до 14.00** по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, +375336070805 (А1) – Жилина Ольга Александровна. Дополнительная информация размещена на сайте организатора.

Извещение о предыдущих торгах по объектам было размещено в газете «Звязда» от 25.07.2023, 20.09.2023.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» 31 октября 2023 года проводит открытый аукцион № 4-АГ по продаже права заключения договора аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

№ предмета аукциона	Арендодатель имущества	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы (руб.)	Начальная цена права заключения договора аренды имущества / сумма задатка (руб.)	Наименование и целевое использование имущества
1	**УП «МИНГАЗ», тел. 8017 2992947**	**г. Минск, ул. Матусевича, 35Б**	2182,0	8495,40 (за всю площадь)	1843,79	Отдельно стоящее здание под оказание услуг (заправка)

Договор аренды заключается сроком **на пять лет.**

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.

Аукцион состоится **31 октября 2023 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 06 октября 2023 г. по 27 октября 2023 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 01 90 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционе **№ 4-АГ от 31.10.2023** по предмету аукциона № 1. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

Телефон для справок +375 (17) 360 42 22.

АХОЎНІК АД УЛЬТРАФІЯЛЕТАВАЙ РАДЫЯЦЫІ

Азонаваму слою патрэбна дапамога людзей

Забарона ўжывання азонаразбуральных рэчываў, адмова ад тэхнікі, якая працуе на рэчывах, што маюць патэнцыял глабальнага пацяплення, укараненне азонабяспечных тэхналогій, ужыванне прыродных холадагентаў замест сінтэтычнага фрэону... Гэтыя і іншыя намаганні супрацьстаяння зменам клімату і спрыяння аднаўленню азонавага слою ажыццяўляюцца ў рамках Манрэальскага пратакола і прынятай Кігалійскай папраўкі да яго. Па словах спецыялістаў, за час работы міжнароднага дакумента 99 % азонаразбуральных рэчываў, якія рэгулююцца пратаколам, выведзены з выкарыстання, што ў тым ліку паспрыяла і скарачэнню выкідаў парніковых газаў. Ёсць станоўчыя змены ў стане азонавага слою — па ацэнках вучоных, утрыманне азону ў стратасферы да канца XXI стагоддзя можа аднавіцца да ўзроўню 1980 года. А рэалізацыя Кігалійскай папраўкі ўсімі краінамі можа знізіць рост сусветнай тэмпературы на 0,5 °С да 2100 года. Што неабходна рабіць, каб выратаваць нашу планету і жыццё на ёй, расказалі спецыялісты.

Экалагічныя абавязкі і дакументы: сусветныя і айчынныя

Манрэальскі пратакол працуе з 1987 года, і, дзякуючы пастаўленым у дакументе задачам, скіраваным на *забарону азонаразбуральных рэчываў, ён абараняе ўсё жывое на Зямлі ад жорсткай ультрафіялетавай радыяцыі. Ахоўвае людзей ад такіх сур'ёзных захворванняў, як меланома, катаракта. Абараняе нашы экасістэмы, запавольвае змяненне клімату, таму што большая частка азонаразбуральных рэчываў, якія рэгулююцца Манрэальскім пратаколам, адначасова мае і значны патэнцыял глабальнага пацяплення,* — расказала **Наталля КЛІМЕНКА, кансультант упраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасферныя паветра, змяненне клімату і экспертызы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— У 2016 годзе прынята Кігалійская папраўка да Манрэальскага пратакола, якая скіравана на рэгуляванне спажывання гідрафторвугляродаў — рэчываў, якія не маюць патэнцыялу азонаразбурэння, аднак з'яўляюцца магутнымі парніковымі газамі. Пры гэтым патэнцыял глабальнага пацяплення некаторых гідрафторвугляродаў у 1000 разоў перавышае патэнцыял вуглякіслага газу, які лічыцца эталонам адзінкі вымярэння. З улікам значнага выкарыстання гідрафторвугляродаў ва ўсім свеце, найперш для ахаладжвання і кандыцыянiравання паветра, папраўка можа зрабіць значны ўнёсак у скарачэнне выкідаў парніковых газаў.

Беларусь у ліку першых 36 краін актыўна далучылася да экалагічных працэсаў, прыняла Венскую канвенцыю аб ахове азонавага слою ў 1986 годзе, а таксама яе Манрэальскі пратакол, узяла на сябе абавязкі па скарачэнні і адмове ад азонаразбуральных рэчываў і ўсе гэтыя гады выконвала адпаведную работу. На момант падпісання Манрэальскага пратакола **наша краіна спажывала каля трох тысяч азонаразбуральных рэчываў штогод, а з 2020-га Беларусь іх больш не выкарыстоўвае.**

— Асноўны дакумент у сферы рэгулявання абыходжання з азонаразбуральнымі рэчывамі — Закон «Аб ахове азонавага слою», якім прадугледжаны рэгуляванне ўжывання такіх рэчываў, абавязкі для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў па скарачэнні выкарыстання азонаразбуральных рэчываў і ўкараненні азонабяспечных тэхналогій, — нагадала спецыяліст. *— Законам таксама вызначана забарона на выкід азонаразбуральных рэчываў у паветра і ўкараненне абсталявання і прымяненне тэхнічных рашэнняў, якія заснаваны на азонаразбуральных рэчывах.*

Летась у кастрычніку ў Беларусі прынялі закон, які ратыфікаваў Кігалійскую папраўку да Манрэальскага пратакола. Для рэалізацыі гэтага дакумента вядзецца работа па прывядзенні нашага заканадаўства ў адпаведнасць з Манрэальскім пратаколам. Найперш прадугледжана карэкціроўка Закона «Аб ахове азонавага слою» — дакумент дапрацоўваецца і дапаўняецца такімі азначэннямі, як «гідрафторвугляроды», «патэнцыял глабальнага пацяплення».

Цяперашні закон рэгулюе абыходжанне толькі з азонаразбуральнымі рэчывамі, а ў новым варыянце дакумента парадак рэгулявання будзе распаўсюджаны і на гідрафторвугляроды. Мяркуецца вызначыць абавязак для юрасоб і ІП па скарачэнні выкарыстання гідрафторвугляродаў, абсталявання і тэхнічных прылад, якія ўтрымліваюць такія рэчывы, у тым ліку па ўкараненні азоназберагальных тэхналогій і працэсаў рэкуперацыі, рэцыркуляцыі і абясшкоджвання гідрафторвугляродаў з мэтай змяншэння іх ужывання. Плануецца таксама, што будуць весціся ўлік такіх рэчываў і ведамасная справаздачнасць аб выніках уліку, шэраг іншых змен.

Азонавыя дзіркі «цыруюцца»

У Беларусі працуюць тры пункты назірання за азонам: у Мінску, Гомелі і санаторыі «Нарач». Па ацэнках вынікаў маніторынгу стану азонавага слою над Беларуссю, вучоныя прыходзяць да высновы, што пачынаючы з 2000-х трэнд памяншэння азонавага слою над краінай запаволіўся ў пяць разоў у параўнанні з 1990-мі, паведаміў **Цімафей ШЛЕНДЭР, навуковы супрацоўнік Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы Белдзяржуніверсітэта:**

— Раней трэнд памяншэння азону быў каля 1,5 адзінкі Добсана (адзінка вымярэння ўтрымання азону ў атмасферы Зямлі) у год, цяпер — 0,3 адзінкі Добсана. У Паўночным паўшар'і змяненне азону нязначнае ці блізкае да нуля. У Паўднёвым паўшар'і назіраецца рост азону прыкладна на 1 %. У трапічных зонах рост складае каля 0,3 % у год. Гэта сведчыць, што азонавы слой сапраўды аднаўляецца па ўсім свеце.

Па ацэнках вучоных, аднаўленне антарктычнай азонавай дзіркі адбудзецца прыкладна ў 2080—2085 гадах. Арктычная азонавая дзірка адновіцца да свайго значэння 1980 года прыкладна ў 2060—2065 гадах, а ва ўмераных шыротах стан азону адновіцца да значэння 1980 года ў 2050—2055-х, удакладніў спецыяліст.

Халадзільнікі і кандыцыянеры на новы лад

У краіне рэалізоўваецца ўрадам зацверджаны план мерапрыемстваў па выкананні Кігалійскай папраўкі. Вызначаны дапушчальныя аб'ёмы ўжывання гідрафторвугляродаў у Беларусі — 2,5 тысячы тон у год (або пяць мільёнаў тон у эквіваленце CO_2). Да 2036 года спажыванне гідрафторвугляродаў у нашай краіне павінна зменшыцца на 85 %, удакладніла Наталля Кліменка:

— Планам прадугледжаны меры па недапушчэнні падрыхтоўкі і ўзгаднення праектаў нізкатэмпературнай тэхнікі (халадзільнікі, кандыцыянеры), якая працуе на рэчывах, што маюць патэнцыял глабальнага пацяплення звыш 1500 у эквіваленце CO_2 і недапушчэнне ўкаранення такой тэхнікі з 2027 года. Пэўныя патрабаванні вызначаны і экалагічнымі нормамі і правіламі (ЭкаНіП), якія сведчаць, што пры вывадзе з эксплуатацыі абсталявання, якое ўтрымлівае азонаразбуральныя рэчывы, павінны ўкараняцца азонабяспечныя тэхналогіі, што змяншаюць негатыўны ўплыў на клімат.

Асноўная ідэя ратыфікацыі Кігалійскай папраўкі — імпартазамяшчэнне. Мы павінны адыходзіць ад імпартных сінтэтычных фрэонаў, якія забаронены заканадаўствам, і пераходзіць на іншыя альтэрнатывы, якія мінімальна ўплываюць на клімат і не аказваюць уплыву на азонавы слой. Ва ўсім свеце замест фрэону ўжо выкарыстоўваюцца прыродныя холадагенты: CO_2, аміяк, вуглевадародныя холадагенты бутан, прапан, падкрэсліла прадстаўніца Мінпрыроды:

— Аміяк, напрыклад, можна выкарыстоўваць не толькі для ахаладжвання, але і для кандыцыянавання паветра, і такі вопыт у Беларусі ёсць. Кандыцыянеры могуць працаваць на прапане, і такое абсталяванне ўжо ўвозіцца ў нашу краіну.

Штучны холад — элемент харчовай бяспекі

У людзей заўжды было дзве праблемы: холад і цяпло. Каб змагацца з холадам, чалавек асвоіў агонь, пачаў будаваць цёплыя дамы, а для захавання ежы стаў стварацьлядоўні. Аднак тэрмін «штучны холад» з'явіўся толькі ў 1800 годзе, а першая халадзільная ўстаноўка з выкарыстаннем кампрэсараў была распрацавана ў 1838-м. Першы ж халадзільнік з'явіўся ў 1914-м, расказаў **Аляксандр БАМБІЗА, дырэктар Асацыяцыі прадпрыемстваў індустрыі мікраклімату і холаду:**

— Штучны холад сёння — ключавы элемент сусветнай харчовай бяспекі. У халадзільнай галіне працуе больш за мільярд чалавек, на прадпрыемствах Беларусі занятыя сотні тысяч халадзільных сістэм, якім патрэбна больш за 20 % электраэнергіі, што спажываецца ў краіне. І гэта без уліку бытавых халадзільнікаў, якіх у нашай краіне яшчэ каля двух мільёнаў.

У 2004 годзе з'явілася асацыяцыя, задача якой вырашаць практычныя праблемы галіны: рыхтаваць кадры, удасканальваць заканадаўства, адстойваць інтарэсы прадстаўнікоў галіны. Па ініцыятыве арганізацый у 2014 годзе рэалізавана праграма будаўніцтва плодаагароднінасховішчаў, у выніку чаго на 30 % павялічылася колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі, якая паступае ў крамы і на экспарт.

— Сёння мы прасоўваем ідэю глабальнага пашырэння вытворчасці замарожанай плодаагароднінай прадукцыі, у тым ліку на экспарт. Неабходна ўкараняць у краіне і холадавыя ланцугі: калі прадукцыя ад моманту яе вытворчасці да продажу ў крамах захоўваецца ў неабходных тэмпературных рэжымах.

Прыродныя холадагенты замест «фрэонавай іголкі»

Вытворцы халадзільнага абсталявання вельмі залежаць ад патрабаванняў Манрэальскага пратакола і папраўкі да яго, таму што вырашальным фактарам пры вырабе холаду з'яўляюцца холадагенты, падкрэсліў дырэктар асацыяцыі:

— Першапачаткова з выкарыстання былі выведзены хлорфторвугляроды (ХФВ). Калі высветлілася, што холадагенты, якія ўтрымліваюць хлор, наносяць значны ўрон азонаваму слою, сусветная і наша прамысловасць сталі выкарыстоўваць як прамежкавы холадагент 22-і фрэон — гідрахлорфторвугляроды (ГФВ), якія маюць меншы азонаразбуральны эфект. Каб цалкам адмовіцца ад азонаразбуральных рэчываў, Манрэальскім пратаколам прапаноўваецца больш выкарыстоўваць прыродных холадагентаў. Атрымліваецца, што мы пераходзім на сінтэтычныя, якія ўтрымліваюць больш фтору, але ж высветлілася, што і фтор таксама наносіць урон навакольлю, хоць і меншы, чым хлор.

Любыя пераходы на любыя хімічныя рэчывы для халадзільнай галіны будуць заканчвацца аднолькава. Цяпер замяняльнікам ГФВ халадзільшчыкам (разам з прыроднымі холадагентамі) прапануюць гідрараліфіны — злучэнні, якія раскладаюцца пры тэмпературы 170 градусаў і адносяцца да групы PFAS (вечных хімікатаў), куды ўваходзіць больш за 4700 штучна сінтэзаваных рэчываў, якія практычна не раскладаюцца ў прыродных умовах.

— Калі мы будзем пераходзіць на сінтэтыку, то знойдуцца прычыны, па якіх трэба потым ад яе адмовіцца. Таму наша задача — перайсці на прыродныя, эфектыўныя і даступныя холадагенты і пераадолець перапоны на шырокае выкарыстанне аміяку, вуглевадародаў, вуглякіслага газу, — настойвае Аляксандр Бамбіза. — Практычна 90 % гідраліфінаў вырабляецца ў Кітаі, і нам не трэба саджаць гаспадарку на фрэонавую іголку. Прыродныя холадагенты вакол нас, і мы можам іх вырабляць самі і не залежаць ад імпарту.

Кожны можа ўнесці свой уклад у захаванне азонавага слою. Напрыклад, здаваць старыя халадзільнікі ў спецыяльныя арганізацыі. Пры выбары кандыцыянера ў кватэру глядзець, на чым ён працуе, каб менш шкодзіць навакольлю. Кандыцыянеры ў аўтамабілях таксама трэба правільна і своечасова абслугоўваць.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

«ВЯНОК» І «ВЯЗАНКА»

МУЗЕЙ ЯК ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Тутэйшы Дом культуры, дзе базіруецца калектыў, сельскім назваць язык не паварочваецца. Па-першае, вялікі і прасторны, па-другое, жывы і запатрабаваны. Сюды з задавальненнем бягуць і дарослыя, і дзеці, якія жыць не могуць без свайго калектыву «Вязанка». Гэта цэлы сусвет, космас. Напэўна, таму, што кіруюць ім людзі захопленыя і неверагодна таленавітыя. Перасекчыся, як той казаў, дазволіў выпадак. Прыехала ў сельсавет зусім па іншай тэме, але кіраўнік справамі Вяззеўскага сельвыканкама Інеса Прышывалка, яна ж удзельніца ансамбля, прапанавала паглядзець музей у Доме культуры. Так тут называюць творчую майстэрню «Вязанкі». Чаму менавіта музей, зразумела толькі тады, калі кіраўнік калектыву Мікалай Забаўскі, ён жа дырэктар Дома культуры і адзіны ў вобласці дудар, пачаў расказваць пра «экспанаты». Асноўныя з іх — гэта канцэртныя касцюмы, створаныя рукамі саміх удзельніц.

— Мы наогул унікальныя, не робім тое, што ўсе, — усміхаецца кіраўнік. — Мы не сталі прыбірацца ў нешта серыйнае, аднолькавае. Мы ўсё сваімі ручкамі пашылі і вышылі. У нас была вельмі цікавая фотасесія з вашым паважаным фотакарэспандэнтам Анатолем Клешчуком. Апошні раз ён нас здымаў на «Веснавым букеце».

Мікалай Забаўскі запрашае ў музейны пакой і просіць прабачэння, што не ўсе экспанаты на месцах.

— Наш музей, ён жа майстэрня, вытворчы цэх, — тлумачыць ён. — З Іркуцка толькі вярнуліся — не паспелі развесіць. Уражанняў шмат. Аб'ездзілі ўсю Іркуцкую вобласць, на Байкале былі, беларускія вёскі наведалі — ёсць там Тургенеўка такая. Былі ў этнаграфічным музеі «Тальцы», з іркуцкімі, цюменскімі беларусамі сустракаліся. Весела час прайшоў. На мове яны не размаўляюць, але ў іх больш успамінаў, як жылі беларусы раней. І яны ўсё гэта захавалі на адлегласці пяць тысяч кіламетраў ад радзімы.

Кіраўнік расказвае пра тое, якія насамрэч багатыя беларусы, трэба толькі берагчы і дэманстраваць іншым гэты народны скарб. Вельмі важна ведаць свой род і захоўваць яго запаветы. А калі іх ужо забылі, можна паспрабаваць здагадацца. І расказвае цікавую гісторыю пра сябе.

— Гадоў 15 таму мне раптоўна захацелася граць на дудзе. Пачаў разбірацца. Мая бабуля — Марыя Рыгораўна Яльніцкая, а дзед — Аляксандр Сававіч Шкутко. Прадзеды, значыць, Сава і Грышка. А ёсць беларуская народная песня пра тое, як Саўка і Грышка ладзілі дуду. Найбольш вядомы яе варыянт выконваў ансамбль «Песняры». Я падумаў: а можа, гэта пра маіх прадзедаў? І засела думка ў галаве. Вырашыў займець дуду. Жонку з дачкой адправіў у падарожжа па Заходняй Еўропе, а на свае сэканомленыя ад паездкі грошы замовіў у Мінску інструмент і з таго часу граю на ім. Калі дакладна, граю на многіх інструментах — акардэоне, гармоніку, бубне, дудцы, але калі з дудой выходзіш, адразу ўся ўвага на цябе.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

НАРОДНЫЯ СТРОІ СВАІМІ РУКАМІ

Пры майстэрні працуе клуб аматараў традыцыйнага рукадзелля «Пасажніца», якім кіруе жонка Мікалая Георгіевіча — Ірына Забаўская. Яна народны майстар Рэспублікі Беларусь па ручной вышыўцы. Ірына Пятроўна не толькі вышывае, але і тчэ паясы. Гэта, дарэчы, адзіная дэталь ва ўборах удзельнікаў калектыву, якую яны зрабілі не самі, а скарысталіся паслугамі майстра.

Ёсць у музеі аўтэнтычны строй — прабабулі вучаніцы з Вяззеўскай сярэдняй школы Дзіяны Якубоўскай. Дзяўчына з удзелам кіраўніцы аднавіла ўзор і зрабіла строй з такім жа.

Звяртаю ўвагу на незвычайных лялек. Адзін з праектаў Ірыны Забаўскай — Вяззеўскія лялькі-званаркі па матывах традыцыйных мотанак. Толькі яны ў яе яшчэ і музычныя, бо майстрыха саджае іх на гліняныя званочкі. Вяззеўскія артысты не толькі сваіх лялек папулярызуюць, але і з гастроляў прывозяць іншых. Сабралася ўжо вялікая калекцыя. За кожным вырабам — свая гісторыя. І калектыву ўсе яны цікавыя.

Тут ведаюць і папулярызуюць народныя абрады. Адзін з іх — «Тры ручнікі». Адным пакрываюцца галовы маладых, другім яны абвязваюцца, каб быць разам, трэці кладзецца пад ногі. Над апошнім Ірына Забаўская працавала паўгода, яго даўжыня — больш чым два метры. Аднаўляла па кнігах.

Цікавая гісторыя ручніка бабкі Лілііі Маскалёвай з Паташні.

— Вельмі рэдкая рэч, — удакладняе Мікалай Забаўскі. — Ладзілі цэлую навуковую калегію, былі кансультанты з Мінска. Узор характэрны менавіта для Асіповічыны. І такога больш няма нідзе. Можна сур'ёзна казаць, што гэта асіповіцкія ручнікі і мы змаглі іх аднавіць.

У гардэробе пачэснае месца займаюць кашулі калядныя.

— Калі маладыя былі, сядзем на калёсы і ездзім па хатах з гармонікам, — усміхаецца Інеса Прышывалка. — Сёння калядаваць ходзяць дзеці.

І ШЫЕМ, І ГРАЕМ, І СПЯВАЕМ

Ансамбль «Вязанка» адлічвае сваё існаванне з 1986 года. Інеса Прышывалка ў ім якраз з дня заснавання. Прызнаецца, што, як толькі скончыла музычную ўстанову, атрымала размеркаванне ў Вяззеўскую калгасную музычную школу. І апынулася ў цэнтры падзей.

— У гэты ж час да нас на работу ў Дом культуры прыбыў пасля інстытута Мікалай Георгіевіч Забаўскі, які заснаваў хор, — расказвае яна. — Адразу ж сюды ўся моладзь пацягнулася. Потым хор трансфармаваўся ў ансамбль песні і музыкі «Вязанка». У канцы 90-х атрымалі званне «Народны калектыў».

Калі прыйдзеце на канцэрт «Вязанкі», Інесу Прышывалку адразу ж пазнаеце па цымбалах, на якіх яна грае вельмі віртуозна. Ад мілагучных мелодый ногі самі пачынаюць танчыць.

Тут жа ў Доме культуры зазіраем у бібліятэку, дзе знаёмімся з бібліятэкаркай Лілііяй Маскалёвай, уладальніцай рэдкага ручніка бабулі з Паташні. Яна таксама ўдзельніца калектыву. У куточку бібліятэкі бачу яшчэ адзін цікавы экспанат — касцюм з вышыўкай.

— Кожны радок сама вышывала, — прызнаецца Лілія Яўгенаўна. — Ірына Пятроўна Забаўская паказвала, а я рабіла. У кожнай з нашых дзяўчат свой касцюм, свая вышыўка. У нас нават падлеткі вышываюць.

Гляджу на касцюм, і нават не верыцца, што тут рука непрафесіянала.

— Калі трэба, прыходзіцца круціцца, — усміхаецца суразмоўніца.

Частка касцюмаў знаходзіцца ў рэпетыцыйнай зале. Цяжкія цёплыя андаракі, лёгкія спадніцы, кашулі — усё таксама выключна ручной работы, ніводнага машыннага шва. Рэпетыцыйная зала, дарэчы, як у вялікім горадзе — уся ў люстэрках, вялікая і ўтульная.

Музей з творчай майстэрні распаўсюдзіўся і на калідоры. Яны завешаны шматлікімі дыпломамі.

Акрамя глядзельнай залы на 300 месцаў, зручныя грымёркі для артыстаў. Калісьці сюды з канцэртам прыязджаў калектыў Міхаіла Фінберга, музыканты засталіся задаволеныя.

Мікалай Забаўскі лічыць, што ў аграгарадку вельмі спрыяльныя ўмовы для творчасці, таму і артыстам тут падабаецца. Дарэчы, званне «Народны» было прысвоена калектыву нездарма. Удзельнікі запісалі і аднавілі больш за 100 аўтэнтычных беларускіх народных песень Асіповіцкага і Клічаўскага раёнаў. Аснову рэпертуару складаюць творы на 3-4 галасы з элементамі харэаграфіі, народныя абрады, тэатралізаваныя народна-святочныя прадстаўленні. Сёлета калектыў збіраецца прайсці атэстацыю, каб атрымаць званне заслужанага.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара
і з архіва Ірыны ЗАБАЎСКАЙ.
Асіповіцкі р-н, аграгарадок Вяззе.

ШТО ЕСЦІ, КАБ... СПАЦЬ?

Змагаемся з восеньскай бессанню з дапамогай правільнага харчавання. І не толькі...

Урач-дыетолаг Наталля БЕЛЯКОВА.

Як ні зацягнулася бабіна лета, восень ужо ўступае ў свае правы. А разам са слотай да многіх пастукалася традыцыйная сезонная бессань. З'ява гэта, адзначаюць медыкі, паўтараецца з году ў год, ёй пакорныя практычна ўсе ўзросты. Раз так, магчыма, пара разабрацца ў прычынах восеньскай бессані і зразумець, што з ёй рабіць і як наладзіць здаровы сон, нават калі за акном — шэрасць і дождж.

Застаёмся зімаваць

Самнолагі даўно вывучылі прычыны сезоннай (а дакладней, міжсезоннай) бессані. Аказваецца, з надыходам восені нас атакуюць два тыпы такіх прычын — фізіялагічныя і псіхалагічныя. Першыя ляжаць у плоскасці чыста практычнай і прыземленай — гэта перапады артэрыяльнага ціску з прычыны няўстойлівага метэаралагічнага становішча, рэакцыя органаў і сістэм нашага арганізма на паніжэнне тэмпературы паветра, а таксама недахоп сонечнага святла пры скарачэнні светлавога дня. Гэты апошні фактар фізіёлагі называюць галоўнай прычынай сезоннага парушэння сну. Справа ў тым, што сонечнае святло напрамую ўплывае на працэсы, якія праходзяць у нашым арганізме, і ў першую чаргу гэта рэгуляцыя біярытмаў, то-бок якраз здаровы сон і, скажам так, «якаснае няспанне», бадзёрасць на працягу дня. Тут і знаходзіцца скрыжаванне фізіялагічных і псіхалагічных прычын восеньскай бессані. Інфрачырвонае выпраменьванне, якое дае сонечнае святло, спрыяе вытворчасці ў арганізме нейрамедыятара сератаніну — таго самага славутага «гармону шчасця». Калі наш арганізм сінтэзуе яго ў дастатковай колькасці, у нас выдатны настрой, мы бадзёрыя і працаздольныя, а дэпрэсію лічым выдумкай няўдачнікаў. Да таго ж такія шчаслівцы яшчэ і спяць як немаўляты. Хутка, без праблем засынаюць, не прачынаюцца ноччу, а раніцай, не чакаючы звону будзільніка, лёгка ўскокваюць з пасцелі і з усмешкай расчыняюць акно ў ранішнюю прахалоду, як прынцэсы ў дыснэеўскіх мульціках. Справа ў тым, што сератанін у сваю чаргу ўплывае на выпрацоўку гармону сну мелатаніну. А раз увосень скарачаецца выпрацоўка сератаніну, то і мелатаніну выпрацоўваецца менш. Адсюль восеньская маркота і, уласна, міжсезонная бессань, аб якой мы гаворым.

Навукоўцы, як ім і належыць, правялі шэраг эксперыментаў, у выніку чаго даказалі, што калі павялічыць колькасць сонечнага святла, то восеньскую бессань — хто б сумняваўся? — як рукой здыме. Але гэтая інфармацыя ў дадзеным выпадку нам нічым не дапаможа: наўрад ці мы, каб высыпацца лепей, кінем усё і паляцім за Экватар, у паўднёвае паўшар'е, дзе цяпер якраз пачынаецца вясна.

Ну і, вядома, да псіхалагічных прычын бессані адносяць смутак з нагоды лета, што незваротна скончылася, а таксама ўсведамленне неабходнасці пасля адпачынку вяртацца да падзабытага рытму «вавёркі ў коле». Адсюль раздражненне, апатыя, стомленасць, маркота і быццам бы беспадстаўная, але гнятлівая трывога (ды яшчэ рэтраградны Меркурый і якая-небудзь Венера ў Казярогу). Ну і бессань — да кучы, як гаворыцца.

Што з гэтым рабіць, спытаеце вы. Ну, сёе-тое — можна, і не з'язджаючы зімаваць у Аўстралію...

Спаць, каб жыць

Але спачатку разбяромся з іншымі прычынамі парушэння сну, якія не залежаць ад нябеснай канцылярыі. І ліквідаваць іх са свайго жыцця цалкам у нашых сілах. А прыкласці намаганні да нармалізацыі сну сапраўды варта, падкрэсліваюць медыкі.

— Цяпер мы ўсё менш і менш часу аддаём сну, забываючы аб яго важнай ролі ў захаванні здароўя, — канстатуе **ўрач-дыетолаг Наталля БЕЛЯКОВА.** — Між тым падчас сну адбываецца адпачынак арганізма і аднаўленне клетак за кошт выпрацоўкі гармону росту; перапрацоўка, замацаванне і захоўванне інфармацыі; падтрыманне нармальнага псіхаэмацыянальнага стану.

Прычынамі бессані медыцына называе, сярод іншага, парушэнне гігіены сну (залішняя фізічная і эмацыянальная актыўнасць перад сном, прыём стымуляцыйных напояў, сон у памяшканнях з крыніцай святла). Парушэнне рэжыму працы і адпачынку (сюды адносіцца, напрыклад, дрэнная звычка сядзець за камп'ютарам ночы напралёт, характэрная для многіх, але часцей за ўсё для тых, хто працуе аддалена). А таксама зніжэнне настрою з-за дысбалансу ў гарманальнай сістэме. Вынікам парушэння сну становіцца не толькі дзённая дрымотнасць. Бяссонніца правакуе цэлы цыкл узаемазвязаных збояў у арганізме. Сярод якіх — зніжэнне імунітэту (што так недарэчны на парозе «ўрачыстага адкрыцця» новага сезона ВРВІ, грыпу, старых і новых штамаў коўіду); праблемы з навучаннем і памяццю; рост верагоднасці развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў, а таксама дэпрэсіі.

— Акрамя таго, бяссонніца прыводзіць да спажывання большай колькасці ежы за кошт зніжэння ўзроўню гармону лептыну і павышэння гармону грэліну, — кажа Наталля Белякова. — А таксама правакуе цягу да салодкага, што з'яўляецца наступствам павышэння ўзроўню гармону надныракавых картызолу (гармону не толькі бадзёрасці, але і стрэсу). Гэта, у сваю чаргу, вядзе да ўтварэння вісцэральнага тлушчу (тлушчавая тканка, якая развіваецца ва ўнутраных органах і навакольных тканках), і, як вынік, да інсулінарэзістэнтнасці.

«Сакрэтны» рацыён

Вось і пачнём барацьбу з восеньскай бяссонніцай з карэкцыі харчавання. Прычым важна працаваць на начны сон ужо зранку.

— Абавязкова трэба снедаць для таго, каб паменшыць колькасць ежы, якая прымаецца на вячэру, — падкрэслівае Наталля Іосіфаўна. — Пераяданне падчас вячэры можа «падарыць» вам пякотку, цяжар і ўздуцце якраз у момант, калі вы спрабуеце заснуць. На працягу дня варта ўключаць у свой рацыён прадукты, багатыя на трыптафан, вітамін B_6, фоліевую кіслату, пакольк гэтыя рэчывы прымаюць удзел у выпрацоўцы мелатаніну.

Вось спіс гэтых прадуктаў, і хоць бы некаторыя з іх (зыходзячы з вашага густу і кашалька) павінны быць у восеньскім рацыёне абавязкова:

- чырвонае мяса і індычка;
- субпрадукты;
- яйкі;
- арэхі (арахіс, міндаль), насенне;
- бабовыя;
- малочныя прадукты і сыры;
- тунец, малюскі, ікра;
- вотруб'е рысавае;
- спаржа;
- ліставая зеляніна;
- буракі;
- цытрусавыя;
- ківі.

Пра сыр варта сказаць асобна. Гэта адзін з прадуктаў, які здольны «дадаць пазітыву», кажуць дыетолагі. Звычайна на пытанне «Якая ежа дапаможа нам адчуць сябе больш шчаслівымі восенню?» спецыялісты называюць трыа: сыр, шакалад, бананы. Ну, яшчэ чырвонае віно (калі, вядома, вы ў прынцыпе п'яце алкаголь). У гэтым выпадку можна выпіваць 100-150 г добрага чырвонага віна ў суткі. Але лепш усё ж перад сном лустачку сыру (30 г) дапоўніць лыжачкай мёду і жменькай грэцкіх арэхаў — і такім чынам сябе парадаваць. Сыр багаты на трыптафан, гэта папярэднік сератаніну, гармону радасці. А мы памятаем, што ўзровень сератаніну ўплывае на ўзровень гармону сну мелатаніну. Такім чынам, і настрой палепшыцца, і спаць мы будзем лепш.

Бананы, акрамя здольнасці паляпшаць настрой, — яшчэ і выдатны пераход ад шкодных дэсертаў да карысных (каб потым, увесну, не дзівіцца, чаму набытая летась сукенка аказалася малая на два памеры). Іншая справа, тлумачаць спецыялісты здаровага харчавання, калі чалавек сур'ёзна «падсеў» на дэсерты (малочны шакалад, «пірожанкі», чызкейкі), яго арганізм цягнецца за вялікай колькасцю цукру ў спалучэнні з высокім утрыманнем тлушчаў. Адсюль ён атрымлівае сваю «дозу» дафаміну і сератаніну, і банан яго наўрад ці здольны суцешыць. Таму, каб «саскочыць» з восеньска-зімовай цягі да каларыйных салодкіх «смачняшак» да бананаў, прыйдзецца дадаць псіхалагічную працу над сабой.

Але самае важнае (з пункту гледжання сувязі харчавання і сну) для барацьбы з бяссонніцай — гэта правільная вячэра.

— Вячэраць варта не пазней чым за тры гадзіны да сну, — падкрэслівае Наталля Белякова. — І вячэра павінна быць лёгка засваяльнай. Вугляводы ў выглядзе агароднінных салатаў, тушаных агароднінных гарніраў. Падыдуць ягады, дапушчальна крыху крупы. Пазбягайце хуткіх вугляводаў (салодкае, выпечка, салодкая садавіна). У вячэрні час прыбярыце з рацыёну

каву, алкаголь і стымулюючыя напоі. Выключыце прыём на ноч вострых страў. Акрамя таго, зменшыце ўвечар колькасць спажыванай вадкасці.

Карысныя звычкі жыцця

Наладзіўшы харчаванне, дадаём фізічную актыўнасць. Агульнавядома, што здаровы сон — вытворная здаровага ладу жыцця без цыгарэт, алкаголю, стрэсаў і шкоднай ежы. І з дастатковай фізічнай актыўнасцю, якая не менш важная для сезоннай нармалізацыі сну, чым правільнае харчаванне. Медыкі сцвярджаюць, што ўсяго толькі 150 хвілін у тыдзень умеранай фізічнай нагрузкі паляпшаюць якасць сну больш чым на 60 %. Справа ў тым, што фізічная актыўнасць — бег трушком, плаванне, танцы і г. д. — здымае псіхалагічнае напружанне і спрыяе выкіду эндарфінаў. Паляпшаецца настрой, нармалізуецца агульны эмацыянальны стан, і спім мы лепш, засынаем лягчэй. Галоўнае — пазбягаць інтэнсіўных трэніровак непасрэдна перад сном, інакш эфект будзе адваротны: псіхіка ўзбуджаная — заснуць не атрымаецца.

А наогул, Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе кожнаму даросламу здароваму чалавеку 150 хвілін у дзень аддаваць аэробнай актыўнасці. Так, гэта дзве з паловай гадзіны. Дзе іх знайсці? Ну, у ідэале — мінус серыял і вячоркі з сяброўкай у піцэрыі або доўгая размова з ёй па тэлефоне. Не атрымліваецца знаходзіць час для штодзённых заняткаў — урачы рэкамендуюць менавіта столькі часу аддаваць фізічнай актыўнасці ў выхадныя, лепш на вуліцы, чым у зале. Рух на свежым паветры насычае нашы клеткі кіслародам, ды і сонечнага святла мы хоць трохі «дабяром» нават у пахмурны дзень.

Яшчэ адзін фактар барацьбы з бессанню — скарачэнне колькасці часу, які мы праводзім «у гаджэтах». Асабліва ўвечар іх лепш адкласці ў бок. Блакітнае святло экрана (а яго выпраменьвае і тэлевізар, і ноўтбук — і смартфон) змяншае выпрацоўку мелатаніну — гармону сну. Калі вы пакуль не заўважылі залежнасці паміж чарговай серыяй і складанасцямі з засынаннем, то звярніце на гэта ўвагу. І паспрабуйце перад сном замяніць гаджэты, напрыклад, на чытанне папяровай (а не электроннай) кнігі — цалкам магчыма, што ваш сон палепшыцца. Гэтая звычка можа стаць добрым рытуалам адыходу да сну.

Дарэчы, стварэнне вячэрніх рытуалаў самнолагі лічаць дзейсным спосабам барацьбы з бессанню. Рытуалы, зразумела, павінны быць спакойнымі і расслабляльнымі. Прыглушыце святло, уключыце заспакаяльную музыку, знайдзіце час на дагляд сябе, выпіце травянога чаю, падумайце аб чымсьці прыемным (а не складайце ў розуме спіс неадкладных спраў на заўтра), памарце. Некаторым падабаюцца эфірныя алеі: засынанню спрыяюць лаванда, маяран, рамонак. Увогуле, прыдумайце сабе рытуал, які будзе паўтарацца з вечара ў вечар. Стаўшы звычкай, ён настроіць на здаровы сон. Асабліва калі адыходзіць да сну вы пачняце ў адзін і той жа час.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

